

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**



Таямніцы беларускіх класікаў — у адной кнізе

СТАР. 6



Сочынскія вынікі прадказваюць... звяркі

СТАР. 8



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛЮТАГА 2014 г. ПЯТНІЦА № 33 (27643) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎ СПАЧУВАННІ ВІКТАРУ ЯНУКОВІЧУ

**Прэзідэнт Беларусі накіраваў спачуванні прэзідэнту Украіны Віктару Януковічу ў сувязі з гібеллю людзей у выніку масавых беспарадкаў у Кіеве. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Беларусь заўсёды асуджала проціпраўныя дзеянні ўдзельнікаў палітычных канфліктаў і неканстытуцыйныя метады вырашэння ўнутрыпалітычных рознагалоссяў, якія непазбежна прыводзяць да эскалацыі насілля», — гаворыцца ў спачуванні.

Ад імя беларускага народа і сябе асабіста Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў спачуванні родным і блізкім загінулых і пажаданні хутчэйшага выздараўлення пацярпелым.

## НЕ ПАТУРАЦЬ ЭКСТРЭМІЗМУ

**Рэспубліка Беларусь занепакоена абвастрэннем сітуацыі ва Украіне, што прывяло да чалавечых ахвяр. Аб гэтым гаворыцца ў заяве Міністэрства замежных спраў Беларусі, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы лічым недапушчальнымі радыкальныя, проціпраўныя метады вырашэння ўнутрыпалітычных рознагалоссяў, — адзначаецца ў заяве. — Нельга не звярнуць увагу на тое, што пры ацэнцы драматычных падзей, якія праходзілі ва Украіне апошнія месяцы, краіны Захаду неаднаразова падкрэслівалі «мірны» характар акцый пратэсту і не хацелі заўважаць незаконнага захопу адміністрацыйных будынкаў, выкарыстання дэманстрантамі ў сутыкненнях з міліцыяй «кактэйляў Молатава», а таксама агнястрэльнай зброі».

Такая пазіцыя, якая мяжуе, па сутнасці, з патураннем радыкалізму і экстрэмізму, адыграла сваю негатыўную ролю ў эскалацыі насілля, лічаць у беларускім МЗС. Падыходы, што прымяняюцца адносна падзей ва Украіне, вельмі адрозніваюцца ад тых ацэнак, якія гучаць у сувязі з пратэснымі акцыямі ў іншых еўрапейскіх краінах, дзе праваахоўным органам даводзіцца прымяняць сілу для навядзення правапарадку.

У заяве таксама гаворыцца: «Беларусь паслядоўна выступае за ўрэгуляванне ўкраінскага палітычнага крызісу мірнымі сродкамі, пры безумоўным выкананні канстытуцыйных норм права і без умяшання звонку. Зноў выказваем надзею на хутчэйшую стабілізацыю сітуацыі ва Украіне».

## Ордэнам Маці ўзнагароджаны 89 шматдзетных жанчын

За нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей ордэнам Маці ўзнагароджаны 89 шматдзетных жанчын з розных рэгіёнаў Беларусі. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 20 лютага, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Сярод удастоеных гэтай узнагароды — работніца Пружанскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа Ірына Зарэмба і настаўніца гімназіі № 2 горада Брэста Валянціна Лук'янчук.

У ліку іншых ордэнам Маці таксама ўзнагароджаны медыцынская сястра Докшыцкай цэнтральнай раённай бальніцы Таццяна Дайлідзёнак, работніца Петрыкаўскага лясгаса Алена Шчука, санітарка Слаўгарадскай ЦРБ Жанна Саўчанка і сацыяльны работнік Нясвіжскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Святлана Дзямідава.

# ГУЛЬНІ З МАРМЫШКАЙ



Нашы госці: Алтангерэл Ігоры і Батсайхан Раднаасамбуу з Манголіі.



Арунас Коска з Літвы.

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.



Эліза Саарэла з Фінляндыі.

**Чэмпіянат свету па лоўлі рыбы на мармышку, які заўтра стартуе на вяслярным канале пад Заслаўем, аб'яднаў прадстаўнікоў розных кантынентаў. За перамогу паспрачаюцца рыбакі-спартсмены трох частак свету — Еўропы, Азіі, Амерыкі. Карэспандэнты «Звязды» наведалі трэніроўку і бліжэй пазнаёміліся з удзельнікамі турніру.**

Здавалася б, старт спаборніцтваў яшчэ не наступіў, але ёсць адчуванне, што кожны рыбалоў ужо загадзя ўключыўся ў барацьбу. Не, яны, безумоўна, вітаюцца, размаўляюць, жартуюць, але калі аказваюцца сам-насам з лункай, іх думкі прысвечаны толькі спаборніцтвам. І ў кожнага з іх — свая тэхніка пошуку рыбы, свае фінты — гульня мармышкай. Напрыклад, для большай зручнасці ўважлівы манголец Батсайхан Раднаасамбуу, прадавец мабільных тэлефонаў з Улан-Батара, наогул лёг на лёд, абаперся на сваю торбу і ўтаропіўся вачыма на паплавок. Жаданне ўдзельнічаць у чэмпіянаце далёкіх мангольскіх рыбакоў наогул здзіўляе і прымушае паважаць. Як кажа Батсайхан, каб трапіць у Мінск, яму і яго таварышам давялося ляцець у Стамбул з дазапраўкай у Бішкеку, правесці колькі дзён у Турцыі, і толькі пасля адправіцца ў Беларусь!

СТАР. 2

*ЛІЧБА ДНЯ*

## $30 млн

***зарабіла на лячэнні ў Беларусі замежных грамадзян і накіравала ў бюджэт сістэма аховы здароўя. Усяго за мінулы год лячэнне ў Беларусі атрымалі каля 160 тыс. замежнікаў. Толькі колькасць грамадзян Украіны, якія атрымалі меддапамогу ў беларускіх лячэбных установах, павялічылася амаль у 1,5 раза. Пра гэта заявіла начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Алена Богдан. Паводле яе слоў, напрацоўкі беларускіх медыкаў запатрабаваныя калегамі з краін Садружнасці. У Казахстане спецыялісты з Беларусі дапамагалі выстройваць рознаўзроўневую сістэму аказання медыцынскай дапамогі маці і дзіцяці. Стварэнне такой сістэмы ў Беларусі прывяло да таго, што цяпер краіна па паказчыку дзіцячай смяротнасці знаходзіцца на ўзроўні такіх краін, як Аўстрыя, Вялікабрытанія, Швейцарыя.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.02.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9720,00 | ■ |
| Еўра | 13360,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 272,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1086,03 | ▲ |

■ Надвор'е

## Цёпла і вільготна

Надвор'е, якое ўсталявалася цяпер, па тэмпературным рэжыме на 4-9 градусаў перавышае кліматычную норму і адпавядае канцу сакавіка. Пра гэта паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.

У выхадныя маларухомы атмасферны фронт з Польшчы прынясе на тэрыторыю Беларусі сырое надвор'е. Днём у суботу і на працягу сутак у нядзелю ў многіх раёнах краіны чакаюцца дождж і мокры снег. Ноччу і раніцай у асобных раёнах туман, магчымы слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, днём — ад 0 да 5 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны да плюс 7 градусаў.

У пачатку наступнага тыдня тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе ад мінус 4 да 1 градуса цяпла, пры праясненнях да 5-7 марозу. Днём ад 0 да 5 цяпла, па паўднёвым захадзе месцамі плюс 6-8 градусаў. У асобных раёнах магчымы слабыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу.

■ Прамая лінія

## ПАДТРЫМКА ПА АДРАСЕ

### Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр Румак адказаў на пытанні нашых чытачоў наконт дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі



Фота Надзеі БУЖАН.

**На гадзінніку роўна 11.00, і тут жа раздаецца першы тэлефонны званок. Аляксандр Румак бярэ трубку, націскае на кнопку гучнай сувязі...**

***— Добры дзень! Да вас звяртаецца Шэлег Ала Рыгораўна са Слуцка. Хацела б даведацца пра адрасную сацыяльную дапамогу. Я інвалід 2 групы, пенсія невялікая. Ці магу я атрымаць сацыяльную дапамогу?***

— Колькі складае ваша пенсія?

***— 1,6 млн рублёў.***

— Для таго, каб атрымаць дзяржаўную адрасную дапамогу, трэба, каб чалавек адпавядаў пэўным крытэрыям. Асноўны крытэрый — гэта ўзровень яго даходаў. Разлічваць на дапамогу можа той, у каго даход меншы за бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ). Сёння БПМ складае 1 млн 128 тыс. рублёў. Гэтая ўмова датычыць штомесячнай дапамогі. Вы, як самі бачыце, не падпадаеце пад яе. Але вы можаце звярнуцца па разавую дапамогу. Там крытэрый — 150% БПМ. Гэтая сума цяпер раўняецца 1 млн 692 тыс. рублёў, так што вы маеце права на падтрымку. Вам трэба звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Слуцкага райвыканкама па такую дапамогу. Яны павінны ўзяць ад вас заяву, а рашэнне будзе прымаць камісія райвыканкама, якую ўзначальвае, як правіла, намеснік старшыні.

Яшчэ для пажылых людзей, пенсіянераў дапамога аказваецца са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН). Так што звяртайцеся, дапамогу вы можаце атрымаць.

*(Працяг «прамой лініі» чытайце ў наступных нумарах «Звязды».)*

**Святлана БУСЬКО.**

***ДАВЕДКА «Звязды»***

Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога — гэта:

— штомесячная і аднаразовая сацыяльныя дапамогі,

— сацыяльная дапамога для пакрыцця выдаткаў на набыццё падгузкаў,

— сацыяльная дапамога на аплату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі,

— забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця.

■ Боль

Бацька загінулай пацыенткі «Экамедсэрвіса»:

## «МЫ ДА АПОШНЯГА ВЕРЫЛІ, ШТО ЮЛЕЧКА ПРАЧНЕЦЦА...»

**Пасля пластычнай аперацыі Юля Кубарава правяла чатыры тыдні ў коме... Да апошняй секунды яе бацькі верылі, што іх дачка будзе жыць...**



Фота з сямейнага архіва Кубаравых.

### «ПАСЛЯ СМЕРЦІ ЮЛІ Я АТРЫМАЎ АД ЯЕ ПАДАРУНАК»

З таго дня, як Юрый і Ала Кубаравы з Гродна пахавалі сваю адзіную дачку, прайшло больш як 9 месяцаў... Але яны дагэтуль не могуць паверыць, што іх Юлі больш няма... Я гэта, вядома, разумела, таму, калі шчыра, не адразу адважылася набраць нумар Юрыя. Баялася, каб, не дай Бог, нейкім недарэчным пытаннем не закрануць за жывое... Юрый адразу ж пайшоў на кантакт. Мяне ўразіла, наколькі цёпла бацька гаварыў пра сваю дачку. Падумала, што паміж імі былі вельмі адкрытыя, даверлівыя адносіны. І не памылілася.

СТАР. 6

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ЗНОЎ ЛЬЕЦЦА КРОЎ...

### Лідары апазіцыі страцілі кантроль над натоўпам. Колькасць ахвяр расце



Кіеўскі Майдан, які прастаяў спакойна ноч на чацвер на фоне пагаднення аб перамір'і, заключанага прэзідэнтам Украіны і лідарамі апазіцыі, але, як высветлілася, не падтрыманага радыкаламі, раніцай у чацвер актывізаваўся. На плошчу пачалі сцякацца ўсё новыя групы актывістаў, так што яшчэ да поўдня іх колькасць перавысіла, паводле розных ацэнак, 10-30 тысяч. Адначасова аднавіліся баявыя дзеянні. Карэспандэнты інфармагенцтваў, якія працуюць на Майдане, паведамілі пра колькасць загінулых ад 7 да 20. Інфармацыю пра сем забітых афіцыйна пацвердзіла міністэрства аховы здароўя Украіны. Такім чынам, агульная колькасць загінулых з моманту аднаўлення сутыкненняў актывістаў і супрацоўнікаў сілавых структур на сённяшні дзень складае 35 чалавек, паведамілі ў міністэрстве.

Учора радыкалы перайшлі ў наступленне. Мітынгоўцы прарваліся да будынка Вярхоўнай Рады. У парламенце заявілі, што ён не будзе працаваць у чацвер і пятніцу, там была абвешчана тэрміновая эвакуацыя. Эвакуявалі і будынак урада. Таксама ёсць звесткі аб эвакуацыі гасцініцы «Кіеў», дзе жывуць у тым ліку дэпутаты Рады.



Па звестках МУС, у ходзе беспарадкаў паранены 23 байцы спецпадраздзялення «Беркут» і салдаты ўнутраных войскаў. Па праваахоўніках вядзецца прыцэльны агонь з агнястрэльнай зброі. Раней на сайце ведамства паведамлялася, што ўдзельнікі масавых беспарадкаў выкарыстоўваюць спецпатроны. Пра гэта сведчыць агляд спецтэхнікі праваахоўнікаў. Следча-аператыўная група падчас агляду вадамётаў канстатавала, што стралкі цэлілі менавіта ў людзей, якія кіравалі спецтэхнікай, — большасць стрэлаў прыпалі на кабіну і лабавое шкло. Частка прабоін утворана ў выніку стрэлаў патронамі, здольнымі прабіць металічную абарону спецаўтамабіляў.

Кіраўнік Крымскага парламента Уладзімір Канстанцінаў, які ўчора праводзіў запланаваныя раней перамовы з КПРФ, ЛДПР, «Адзінай Расіяй» у Маскве, не выключыў аддзялення Крыма ад Украіны ў выпадку абвастрэння сітуацыі ў краіне.

«Магчыма. Калі краіна разваліцца. Усё да гэтага і ідзе», — сказаў у чацвер Канстанцінаў «Інтэрфаксу». Ён лічыць, што «шанц выратаваць краіну яшчэ ёсць. Ён вельмі прывідны, але ён яшчэ ёсць». «Хоць дэфакта расчляненне Украіны ўжо адбылося. Як у такіх умовах праводзіць выбары? Пытанне аб персаналіях цяпер не стаіць, спачатку трэба «патушыць пажар» у краіне. Калі яго не патушыць, то няма чаго будзе ратаваць», — заявіў Канстанцінаў.

Напярэдадні прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін заклікаў Захад жорстка асудзіць экстрэмістаў ад апазіцыі ў Кіеве і адмовіцца ад абвінавачванняў на адрас украінскіх улад. Пра гэта ён заявіў у тэлефоннай размове з канцлерам ФРГ Ангелай Меркель. «Пуцін падкрэсліў важнасць адмаўлення заходніх краін ад абвінаваўчага ўхілу ў дачыненні да дзяржаўнага кіраўніцтва Украіны, а таксама важнасць жорсткага асуджэння апазіцыйных сіл, вінаватых у арганізацыі супрацьпраўных экстрэмісцкіх і тэрарыстычных дзеянняў», — адзначылі ў прэс-службе Крамля.

ISSN 1990 - 763X

14033

9 771990 763008

## КОРАТКА

За тыдзень да пачатку ЧС па хакеі ўсе музейныя ўстановы краіны, за выключэннем Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, пяройдуць на новы рэжым работы — прымаць наведвальнікаў тут будуць не толькі днём, але і ноччу.

Міністэрства фінансаў 26 лютага правядзе аўкцыён цэн па продажы праз Беларускую валютна-фондавую біржу дзяржаўных аблігацый, наміраваных у замежнай валюце, на суму $50 млн.

У Мінску стаўкі адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў павялічаны ў сярэднім на 17,5-18 працэнтаў.

Гомельскі аб'яднаны аўтавакзал услед за ўнітарным прадпрыемствам «Мінсктранс» адмяніў аўтобусныя рэйсы да Кіева (Украіна). Адпраўленне пастаянных кіеўскіх рэйсаў цяпер ажыццяўляецца толькі да Чарнігава.

Сярэднямесячная заработная плата медыцынскіх работнікаў у сталіцы ў 2013 годзе склала Br4,3 млн.

Аграпрамысловы комплекс Беларусі з-за афрыканскай чумы свіней недаатрымаў прыкладна 15 тыс. тон свініны.

■ Не прапусціце!

## «РОДНАЯ ПРЫРОДА»: ЧЫТАЙ І ЛЮБУЙСЯ!

У Выдавецкага дома «Звязда» з'явіўся новы, па-сапраўднаму цікавы і прыгожы праект — часопіс «Родная прырода». Багата ілюстраваны ўнікальнымі фотаздымкамі пейзажаў роднай зямлі, яе вялікіх і малых насельнікаў — звяроў і птушак, раслін і кветак, часопіс, калі яго гартаеш, абуджае самыя светлыя пачуцці, гонар за сваю прыгожую краіну, дорыць адчуванне суладдзя з навакольным светам. Акрамя таго, у ім шмат пазнавальнай інфармацыі, якая, несумненна, будзе цікавая і дарослым, і школьнікам. Да прыкладу, з нумара, які выйдзе на наступным тыдні, вы даведаецеся пра кліматычныя асаблівасці і рэкорды беларускай зімы, пра тое, адкуль у Белавежскай пушчы з'явіліся дзікія коні (тарпаны) і як выглядае самая маленькая сава; прачытаеце, як у хатніх умовах вырасціць кававае дрэва, завочна прагуляецеся па фантастычных мясцінах забалочанага лесу...




**Падпісныя індэксы індывідуальны — 74926 ведамасны — 749262**

А мы ўжо разам з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, якое з'яўляецца заснавальнікам часопіса, працуем над наступнымі нумарамі і, паверце, рыхтуем чытачам «Роднай прыроды» нямала сюрпрызаў і адкрыццяў.

Пра адзін сюрпрыз — ужо цяпер. На наступным тыдні на старонках «Звязды» будуць апублікаваны пытанні віктарыны «Сцежкамі роднай прыроды». Яе пераможцы атрымаюць памятныя падарункі. Падказка: знайсці адказы амаль на ўсе пытанні можна будзе, прачытаўшы свежы нумар часопіса «Родная прырода»....

І гэта далёка не ўсё. Захоўваючы інтрыгу да апошняга, усё ж хочам паведаміць: «Родная прырода» камусьці з вас дапаможа стаць уладальнікам фотакамеры з ультразум-аб'ектывам, якім зручна здымаць звяроў і птушак нават на вялікай адлегласці. Якім чынам? Пра гэта — крыху пазней.

Сачыце за публікацыямі «Звязды», пытайце ў кіёсках ці бібліятэках свежы нумар «Роднай прыроды, цікаўцеся на пошце аб умовах падпіскі на наступныя нумары.

Далучайцеся — будзе цікава!

■ Размовы на кухні

# У СВАЁЙ ХАЦЕ І ДЗІРКІ ГРЭЮЦЬ



**Калі мужчына пачынае сталець, то для яго на першае месца выходзяць сям'я, добрая праца і заробак... Але, відаць, самым галоўным для яго ўзмужнеласці і ўпэўненасці ў нашай краіне лічыцца жыллё. Уласнае жыллё, якое ты пабудаваў або купіў. Нездарма ж кажуць, што мужчыну абавязкова трэба паспець за жыццё пасадзіць дрэва, вырасціць сына і ПАБУДАВАЦЬ ДОМ. Вось пра магчымасці і перспектывы займець гэты самы дом наша размова.**



## ЧАРГАВІКОМ СТАНЕ НЕ КОЖНЫ

**У. К.** — Эх, Сяргей Андрэевіч, вось вы свае мужчынскія абавязкі, лічыце, выканалі: і сын у вас расце, і жыць ёсць дзе. Не ведаю толькі, як наконт дрэва... Але гэта яшчэ паспееце. А вось у мяне ўсё наперадзе. Хаця першы крок зроблены: летась ажаніўся. Жывём пакуль у бабулі. Толькі хто ж не марыць аб уласным кутку? Думаем пра гэта і мы з жонкай. Аднак прыдумаць нічога не можам. Куды звярнуцца? Што рабіць? Можа, хоць вы параду дасцё?

**С. К.** — Наколькі я ведаю, ты, Уладзіслаў, у жыллёвай чарзе нават не стаіш. А ў Мінску стаць чаргавіком сёння не проста складана, а амаль немагчыма. Гэта пра тых, хто тут не нарадзіўся. Напрыклад, для таго, каб стаць на такі ўлік, у сталіцы трэба пражыць не менш за 10 гадоў. Праўда, існуе адна «шчылінка»: калі чалавек зарэгіструе шлюб з мінчанкай і атрымае магчымасць стаць на такі ўлік як член сям'і.

**У. К.** — Я ж тут з самага нараджэння жыву! Гэта мой родны горад. Ды і жонка мая ў Мінску нарадзілася. Толькі які там можа быць для нас улік, калі і ў мяне, і ў яе хапае «метраў» у бацькоўскіх кватэрах. Я чуў, што цяпер правілы сталі больш жорсткімі: улічваецца абсалютна любая «плошча». Таму на чаргу я разлічваць не магу.

**С. К.** — Метраў у яго хапае, а ён яшчэ і на ўласную кватэру пакваліўся! А з другога боку, добра жыць не забароніш. Спрабуй! У вашым выпадку сям'я можа ўстаць у жыллёвую чаргу не толькі ў выканкаме, але і па месцы працы. Пішы адпаведную заяву на імя прафсаюзнага кіраўніка рэдакцыі. І спадзявайся, што «пракоціць». А ўвогуле варыянт з жыллёвай чаргой па месцы працы з'яўляецца ідэальным для тых, хто працуе ў Мінску, але тут не зарэгістраваны. А наконт цябе і тваёй сям'і перспектыва такая. Хутка з'явіцца малое, потым — другое, пасля чаго ў жыллёвую чаргу вас упішуць абавязкова. Пры нараджэнні трэцяга дзіцяці атрымаеш статус шматдзетнай сям'і і трапіш у спецыяльную чаргу, якая рухаецца даволі хутка.

**У. К.** — Гэта яшчэ колькі чакаць давядзецца... Атрымаецца, што трэба будзе жыць, умоўна кажучы, «у бабулі», яшчэ гадоў так... «наццаць». Ды і там не факт, што нешта дадуць. Хто ведае, што будзе праз столькі гадоў. Можа, для шмадзетнасці неабходна будзе пяцярых «настругаць». Чуткі аб гэтым, між іншым, гуляюць. Нешта падказвае мне, што я магу спадзявацца толькі на сябе.

## ЗАЎТРА З МЕХАМ ПРЫХОДЗЬ

**С. К.** — Я так разумею, што ты хуценька «рабіць» дзяцей не згодны? Уласных зберажэнняў у цябе, напэўна, з жабіны прыгаршчы. Таму адзінае, што табе застаецца, — упартая праца і крэдытная багна... А па жыллёвых крэдытах не такі вялікі выбар сёння існуе.

**У. К.** — Я не супраць нараджэння малых. Толькі дзе іх гадаваць? Мне здаецца, што больш правільна спачатку даць сям'і, дзе жыць, а потым ужо і дзяцей нараджаць прасцей будзе. А крэдыты вы правільна багнай называеце — іначай не скажаш. Там жа працэнты завоблачныя, пераплаты... Нам бы нейкі больш «пад'ёмны» крэдыт.

**С. К.** — Мабыць, на льготны намякаеш? Так, недзе тры гады таму большасць чаргавікоў менавіта на дзяржаўную падтрымку ў выглядзе льготнага крэдытавання і разлічвала. Сёння сітуацыя істотна змянілася: не можа цяпер дзяржава ўсіх бескватэрных за бюджэтныя грошы «спансіраваць». Ільготны крэдыт могуць атрымаць толькі пэўныя катэгорыі слабаабароненых. Напрыклад, пры пэўных умовах на яго могуць разлічваць маладыя сем'і з двума непаўналетнімі дзеткамі — на дваццаць гадоў пад 50% стаўкі рэфінансавання (сёння атрымліваецца 11,75% гадавых). Тым, хто пастаянна жыве ў населеных пунктах з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек і ў гарадах-спадарожніках, ільготны крэдыт даецца пад 10% стаўкі рэфінансавання таксама на 20 гадоў. На крэдыт пад 20% стаўкі рэфінансавання могуць разлічваць і пэўныя катэгорыі грамадзян, якія прастаялі ў жыллёвай чарзе шмат часу і маюць невялікі даход на кожнага члена сям'і. А вось для шматдзетных прадугледжаны льготны крэдыт на 40 гадоў пад 1% гадавых. Тут жа я ўдакладню, што на такі крэдыт могуць разлічваць толькі тыя, у каго агульны кошт маёмасці не перавышае двухкратнага гранічнага памеру крэдыту.

**У. К.** — Намякаеце, што льготны крэдыт мне не свеціць? А можа быць, я ўсё ж такі хачу іпатэку. У нас жа ёсць крэдыты пад будаўніцтва або набыццё жылля. Зусім нядаўна вы, Сяргей Андрэевіч, самі пра гэта пісалі. На жаль, засталося такіх прапаноў зусім мала — толькі тры. У Беларусбанку, Белаграпрамбанку і Белгазпрамбанку. Першы дае пад 38,5% гадавых на 75% кошту кватэры. Грошы трэба вярнуць за 15 гадоў. Другі — пад той жа працэнт на 90% ад кошту жылля і на 20 гадоў. Трэці — пад 46,5% гадавых на 70% жылля. Тэрмін вяртання — 15 гадоў. Можа быць, паспрабаваць?

**С. К.** — Давай спынімся на больш-менш танным крэдыце пад 38,5% гадавых. Пад такія працэнты яго даюць дзяржбанкі толькі жыллёвым чаргавікам менавіта пад будаўніцтва жылля. Белгазпрамбанк сёння рызыкнуў выдаваць «доўгія» грошы і пад набыццё кватэр. У гэтым выпадку працэнты, як бачым, ужо большыя, ды і фінансуецца толькі да 2/3 кватэры. А цяпер больш падрабязна пра ўмовы атрымання такіх крэдытаў. У дзяржбанкаў існуюць свае мінусы: для вызначэння максімальнай сумы крэдыту яны бяруць у разлік толькі чысты даход аднаго заяўніка. Раней максімум крэдытнай сумы выводзілі з сукупнага даходу сям'і. У Белгазпрамбанку прынцып разліку максімальнага памеру пазыкі прыкладна такі ж. Аднак для павелічэння сумы крэдыту дазваляецца прыцягваць паручыцеляў — у разлік возьмуць чвэрць іх даходу.



Фота Тараса ШЧЫРАГА.

Калі больш уважліва прыглядзецца да гэтых самых працэнтаў, то мы ўбачым такія велізарныя сумы пераплат, што на сценку палезеш. Я тут падлічыў, што калі браць крэдыт у памеры 500 млн рублёў (неабходная сума для набыцця невялікай кватэры) у Белгазпрамбанку на 15 гадоў пад 46,5%, то ўсяго трэба будзе заплаціць амаль 1,7 млрд рублёў. Пераплата банку звыш атрыманых грошай — ледзь не 1,2 млрд. Таму заўтра з мехам прыходзь...

**У. К.** — Так, невясёлая лічба. Дзе ж узяць такія грошы? Атрымліваецца, што трэба будзе выплачваць прыкладна па 9,5 млн у месяц... Мне давядзецца не толькі не есці, але і пазычаць у суседзяў... Не, я ведаў, што там вялікія працэнты, але, пакуль не падлічыш, усё выглядае прыстойна. Атрымліваецца, што 500 млн я не пацягну. Лепш недзе палову сумы ўзяць, а астатняе пазычыць без працэнтаў у сяброў. Можа, вы якія дзве-тры тысячы дасцё?

## ДОБРЫ ДЗЯДЗЬКА ПАРУЧЫЦЕЛЬ ЦІ ІПАТЭКА?

**С. К.** — Як малодшаму сябру, мабыць, тысячу і дам. Але мне здаецца, што вы мяне яшчэ і паручыцелем зрабіць захочаце. Толькі на гэта я ўжо дакладна не пагаджуся, як ні ўпрошвайце.

**У. К.** — Чаму? Вы мне не даверыце, ці што? Вы ж ведаеце, што я вас падстаўляць не буду, як некаторыя робяць.

**С. К.** — Хлопец ты добры, і ведаю я цябе быццам не першы год. Аднак грошы ў банка пазычаюцца вялікія. А калі з табою што-небудзь здарыцца, то перад банкам па такім крэдыце цяпер і я ўсёй сваёй маёмасцю адказваць буду. А цяжкія сітуацыі з паручыцельствам усё часцей пачалі сустракацца і ў нас. Напрыклад, некалькі месяцаў таму ў Бабруйску людзі бралі крэдыты, праштрафіліся, а ў выніку па чужых даўгах вымушаны былі расплачвацца паручыцелі. Судовыя выканаўцы ў іх нават дамы апісалі і выставілі на таргі. А мне мая нерухомасць даволі цяжка далася, каб такім чынам з ёю развітвацца.

**У. К.** — Ну тады ўсё. Не відаць мне ніякай кватэры. Хаця хто ведае: можа быць, мне той крэдыт і так не далі б. У банкаў вельмі жорсткія правілы адбору. Адна знаёмая, напрыклад, не змагла пазычыць у банка вялікую суму грошай проста таму, што ў яе была «дрэнная» крэдытная гісторыя. Карацей, яшчэ раней яна купляла ў крэдыт мабільны тэлефон. І выплачвала штомесяц мізэрную суму (каля 100 тысяч рублёў) кожны раз са спазненнем на два дні — так яна атрымлівала грошы на працы. Пры разглядзе заяўкі банк звярнуў на гэта ўвагу. Дзяўчыне сказалі, што калі яна так неадказна сябе паводзіць з маленькім крэдытам, то вялікі ёй не дадуць.

**С. К.** — Згодны. З банкамі і сапраўды жартаваць не варта. Днямі майму сваяку адмовілі ў камерцыйным банку толькі таму, што ён не паведаміў аб былым паручыцельстве. Забыўся або не надаў увагі гэтаму. Здаецца, дробязь, але крэдыт не атрымаў.

**У. К.** — Слухайце, а чаму ўвогуле ў нас такія непад'ёмныя «іпатэчныя» крэдыты? Вунь жа ў Еўропе, наколькі я ведаю, такія пазыкі выдаюць пад 3-5% гадавых. І тэрміны пагашэння ў іх часам большыя — ад 20 да 40 гадоў. Імі можна пакрыць ад 60% да 70% кошту жылля. Нам такія танныя крэдыты і не сніліся...

**С. К.** — У свой час Беларусбанк распрацаваў нешта падобнае пад назвай «сістэма будзберажэнняў». Аднак калі адбыўся крызіс і пайшла ўгору інфляцыя, гэтая сістэма забуксавала, а потым і ўвогуле знікла. Крыху пазней спецыялісты Мінбудархітэктуры растлумачылі мне, што іпатэка стане сапраўдным дзеючым інструментам толькі ў тым выпадку, калі інфляцыя ў краіне будзе не больш за 8-10% у год. Так што, дружа, іпатэку ты, можа, і дачакаешся. А табе асабіста я параіў бы «пабудавацца» не ў загазаваным Мінску, а, скажам, у горадзе-спадарожніку, дзе і прырода лепшая...

**У. К.** — Ага, ужо пабег...

**P.S. Аўдыязапіс размовы можна знайсці на *zvyazda.by.***

**Сяргей КУРКАЧ,**
**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

# ГУЛЬНІ З МАРМЫШКАЙ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Эксперты лічаць, што змагацца за прызы манголам на беларускім лёдзе будзе складана, аднак ніхто не здзівіцца, калі госці з усходу зоймуць месца ў сярэдзіне агульнай табліцы. Пра літоўцаў падобнае не скажаш. На леташнім першынстве прыбалты занялі трэцяе месца, а таму і цяпер хочуць трапіць на п'едэстал. Што казаць, калі нават на трэніроўцы Арунас Коска з мястэчка Ёнава дастаў з лункі ляшча вагой 2,1 кілаграма.

— Сам здзіўлены, — шоргаючы па лёдзе вялікімі ботамі, з усмешкай апавядае Арунас. — Я, між іншым, у Літве лешчука і на 3,5 кілаграма злавіў. Але тады мы спецыяльна хадзілі на падобную рыбу і прыкладна ведалі, што зловім. А тут — сапраўдная нечаканасць!

**— Ці камфортны канал для правядзення падобных спаборніцтваў?**

— Умовы на гэтым канале — ідэальныя. Мяркую, што і ўлову тут хопіць на ўсіх рыбакоў.

Як ужо паведамляла наша выданне, гендарных абмежаванняў на першынстве свету не будзе. А таму адразу тры краіны — Чэхію, Латвію, Фінляндыю — прадставяць таксама і рыбачкі.

— Усё, што тут адбываецца, мяне захапляе, — акідваючы позіркам канал, заўважае Эліза Саарэла з Фінляндыі. — Я ніколі не была ў Беларусі, але перад прыездам пазнаёмілася з вашай краінай у інтэрнэце.

Цікава, што нават на трэніроўках за рыбакамі назіраюць прадстаўнікі суддзейскага камітэта.

— Пакуль ніякіх парушэнняў не было. Усе спартсмены адаптаваліся да канала і знайшлі сваю рыбу. Мяркую, што лавіць пераважна будуць акуня, ёршыка, плотку, — тлумачыць старшы суддзя Андрэй Каўрыжкін. — Што тычыцца кліматычных умоў, лёд у зоне правядзення спаборніцтваў вельмі добры. На ім няма глыбокага снегу, амаль адсутнічае вада. Аднак лёд крыху падтаў каля берагоў, і мы адзначылі чырвонымі стужкамі небяспечныя зоны для пераходаў. Калі сітуацыя пагоршыцца, зробім адмысловыя масты. Хто пераможа ў чэмпіянаце? Цяжка сказаць. Мяркую, што будзе прысутнічаць так званы фактар шанцавання. Магчыма, той, хто натрапіць на падлешчыка, здолее зрабіць свой улоў больш важкім. Нядрэнныя шанцы ўзысці на п'едэстал мае і Беларусь. Спадзяюся, нашы хлопцы здолеюць сабрацца і прадэманстраваць добры вынік.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

*Мінскі раён.*



■ Меркаванне

# ФРАНЦЫЯ — БЕЛАРУСЬ: ВЫХАД З «ДЫПЛАМАТЫЧНАЙ КОМЫ»

**Пачатак лютага адзначыўся чарговымі крокамі айчыннай дыпламатыі па нармалізацыі стасункаў з краінамі Еўрапейскага саюза. Яшчэ напрыканцы мінулага месяца з афіцыйным візітам у Брусэлі пабывала намесніца Міністра замежных спраў Беларусі Алена Купчына, а ўжо 5–6 лютага ў Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё прадстаўніцтва асацыяцыі «Дзелавы клуб «Францыя — Беларусь», падчас якога нашу краіну наведала дэлегацыя прадстаўнікоў французскага бізнесу. Згодна са статутнымі мэтамі клуба, структура мусіць суправаджаць французскі бізнес у Беларусі і садзейнічаць гандлёва-інвестыцыйнаму супрацоўніцтву паміж краінамі. Сам узровень французскай дзяржавы — яе вага ў сістэме Еўрапейскага саюза, эканамічны, тэхналагічны і навуковы патэнцыял — вымушае вельмі ўважліва паставіцца да новага франка-беларускага праекта ў кантэксце агульнага аналізу двухбаковых адносін.**

## АД СЯРЭДНЯВЕЧЧА ДА «ХАЛОДНАЙ ВАЙНЫ»

Беларуска-французскія зносіны маюць досыць даўнюю гісторыю, карані якой бяруць пачатак яшчэ ў Сярэднявеччы. Пэўныя гандлёвыя сувязі паміж беларускімі і французскімі землямі існавалі яшчэ ў перыяд Полацкага княства. А напрыканцы XVI стагоддзя на каралеўскім троне Рэчы Паспалітай некалькі месяцаў знаходзіўся Генрых III Валуа, які пасля таемна ўцёк з Варшавы, спакусіўшыся на больш прывабную перспектыву стаць французскім манархам. Некаторым чынам краіны звязвае асоба ўраджэнца Берасцейшчыны Тадэвуша Касцюшкі, які адначасова прызнаны ганаровым грамадзянінам Францыі і нацыянальным героем Беларусі.

Другая сусветная вайна звяла беларусаў і французаў у якасці баявых паплечнікаў. Ураджэнцы заходніх абласцей Беларусі прынялі ўдзел у вызваленні Францыі ў складзе вайсковых часцей польскага эміграцкага ўрада, сотні нашых землякоў змагаліся ў структурах французскага руху Супраціўлення. Некаторым, як, напрыклад, мінчанцы Надзеі Лісавец, былі нават прысвоены афіцэрскія званні французскага войска. У сваю чаргу французскі авіяцыйны полк «Нармандыя» змагаўся з немцамі на ўсходнім фронце, у тым ліку браў удзел у аперацыі па вызваленні Беларусі ў 1944 годзе. За мужнасць, праяўленую французскімі лётчыкамі падчас фарсіравання ракі Нёман, загадам савецкага вайсковага камандавання палку быў прысвоены ганаровы дадатак «Нёман». Менавіта пад назвай «Нармандыя-Нёман» французскі авіяполк увайшоў у гісторыю Другой сусветнай вайны.

Пасля Перамогі Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка і Францыя аказаліся сярод 50 краін — удзельніц канферэнцыі ў Сан-Францыска (ЗША), дзе і быў падпісаны Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і закладзены асновы пасляваеннага раскладу сіл у свеце.

## ПАМЫЛКОВЫ ШЛЯХ ФРАНЦУЗСКІХ ДЫПЛАМАТАЎ

Менавіта Францыя была адной з першых сусветных дзяржаў, якія юрыдычна прызналі суверэннасць Рэспублікі Беларусь. На пачатку 1992 года Мінск з афіцыйным візітам наведаў тагачасны міністр замежных спраў Францыі Ралан Дзюма, у адказ на працягу 1992–1995 гадоў адбыліся паездкі кіраўнікоў беларускага ўрада і Вярхоўнага Савета ў Францыю. У ліпені 1996 года па запрашэнні французскага кіраўніка Жака Шырака адбыўся афіцыйны візіт у Францыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Не будзе перабольшваннем сказаць, што гэта мела моцны ўплыў на беларускае кіраўніцтва. Айчынная дзяржаўная мадэль з двухпалатным парламентам і моцнымі паўнамоцтвамі прэзідэнта крыху нагадвае французскую, а беларускі лідар у далейшым неаднаразова ўзгадваў дзейнасць французскага кіраўніка Шарля дэ Голя ў якасці аднаго з пазітыўных прыкладаў у сусветнай палітыцы.

На жаль, французская дыпламатыя не здолела адэкватна ацаніць падзеі палітычнага крызісу 1996 года ў Беларусі, прадбачыць вынікі супрацьстаяння паміж дэпутатамі і Прэзідэнтам, таму заняла заведама няўдалую пазіцыю падтрымкі былога Вярхоўнага Савета, які не карыстаўся даверам насельніцтва і не меў рэальных магчымасцяў уплываць на працэсы кіравання краінай. Францыя крытычна паставілася да новай беларускай сістэмы дзяржаўнага кіравання, у выніку ратыфікацыя шэрагу важных міждзяржаўных дагавораў, уключаючы фундаментальны Дагавор аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве, была прыпынена французскім бокам.

## НОВЫЯ КАНТАКТЫ АКТУАЛІЗУЮЦЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У далейшым бакі неаднаразова спрабавалі выйсці на новыя шляхі паразумення, адбываліся абмены візітамі міжурадавых дэлегацый і дзелавых колаў… Але, як трапна адзначыў у 2012 годзе пасол Францыі ў Беларусі Мішэль Рэнеры, «нашы стасункі па-ранейшаму знаходзяцца ў актыўным пошуку пунктаў судакранання».

Да апошняга часу менавіта такая характарыстыка цалкам адпавядала характару беларуска-французскай камунікацыі. Відавочна, што мець падобны ўзровень стасункаў з адной з найбольш уплывовых краін Еўрасаюза для Беларусі проста немэтазгодна. Згаданыя недапрацоўкі тычацца не толькі палітычнага супрацоўніцтва, але і ўзаемнага гандлёвага абароту. У 2013 годзе ён склаў усяго 600 мільёнаў долараў ЗША з вялікім адмоўным сальда для нашай краіны.

Беларуская вытворчасць слаба прадстаўлена ў Францыі, а французскі бізнес не спяшаецца інвеставаць у Беларусь. Мінулая інерцыя, стэрэатыпы, адсутнасць аб'ектыўнай інфармацыі перашкаджаюць усталяванню ўзаемавыгаднай кааперацыі. А між тым яшчэ ў 2010 годзе падчас візіту ў Мінск функцыянера французскага міністэрства замежных спраў П'ера Лелуша бакі дамовіліся аб планах па супрацоўніцтве ў энергетыцы, транспарце, машынабудаванні.

Існуе думка, што менавіта з мэтай дабіцца пазітыўных вынікаў у французска-беларускіх стасунках у Парыж быў накіраваны вопытны беларускі дыпламат Павел Латушка. Ён лічыць, што сучасны ўзровень узаемаадносін (як палітычнага, так і эканамічнага характару) «абсалютна не адпавядае наяўнаму патэнцыялу бакоў».

Відавочна, што Беларусі для эфектыўнага ўзаемадзеяння з вядучымі краінамі свету неабходна як ствараць магчымасці для іх прысутнасці ў Беларусі, так і дамагацца ўтварэння ўласных сістэм супрацоўніцтва за мяжой. Такая схема дазволіць айчыннай дыпламатыі больш эфектыўна адстойваць беларускі інтарэс на міжнароднай арэне, асабліва ў стасунках з Еўрапейскім саюзам, дзе важнае значэнне надаецца грамадзянскай супольнасці і закладзены калегіяльны прынцып прыняцця рашэнняў.

Такі прынцып прадугледжвае, што краіна з акрэсленымі задачамі знешняй палітыкі мае магчымасць пераканаць у мэтазгоднасці тых ці іншых рашэнняў астатніх партнёраў, што не маюць такіх выразных інтарэсаў. У дачыненні да Беларусі такое правіла спрацоўвала ўжо не раз, калі палітыка санкцый і абмежаванняў з боку Еўрасаюза да нашай краіны прымалася па ініцыятыве пэўных фінансава-палітычных колаў Рэспублікі Польшча.

Актуальным рашэннем для таго, каб пазбегнуць падобнай сітуацыі ў будучыні, з'яўляецца ўтварэнне цікавага і для Беларусі, і для Францыі двухбаковага парадку і механізмаў камунікацыі. Безумоўна, з такога пункту бачання Францыя выглядае вельмі перспектыўным партнёрам для Беларусі. Што тычыцца самой Францыі, то палітычны істэблішмент гэтай краіны апошнім часам шмат гаворыць аб неабходнасці «актывізацыі французскай палітыкі ў Еўропе». На пачатку 2014 года была абнародавана інфармацыя аб намеры міністраў замежных спраў Францыі і Германіі наведаць краіны Усходняга партнёрства. Найперш гэта Малдова і Грузія, але не выключаецца магчымасць візітаў і ў іншыя дзяржавы.

Падобная знешнепалітычная кан'юнктура знешне бачыцца дастаткова прывабнай для ўмацавання двухбаковых кантактаў. Таму застаецца належным чынам скарыстацца наяўнымі ўмовамі і нарэшце дасягнуць пазітыўнага выніку роўнага патэнцыялу магчымасцяў, адкладзены эфект ад якога чакаецца ўжо больш за 20 гадоў — з моманту ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Францыяй і Беларуссю.

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ,**
**дырэктар Інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя»**

■ Еўразійская інтэграцыя

# «АДЗІНАЕ АКНО» ПАСКАРАЕ ЭКАНАМІЧНЫ РУХ?

Учора ў Мінску адбылося пасяджэнне Кансультатыўнага камітэта па мытным рэгуляванні Еўразійскай эканамічнай камісіі. Цэнтральным пытаннем стала стварэнне сістэмы «адзінага акна» ў знешнеэканамічнай дзейнасці.

«Мы займаемся ўдасканаленнем мытнага адміністравання. Але прыйшлі да высновы, што да бясконцасці «шліфаваць» толькі мытныя пытанні немагчыма. Трэба брацца за праблему комплексна, — заявіў **Уладзімір Гошын, член Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі (міністр па мытным супрацоўніцтве).** — Як паказвае перадавы вопыт Сінгапура, Карэі і Казахстана, у гэтым дапамагае ўкараненне сістэмы «адзінага акна» ў знешнеэканамічнай дзейнасці. Гэта значыць, што інфармацыя падаецца экспарцёрам ці імпарцёрам толькі адзін раз у пэўную камп'ютарную сетку і становіцца даступнай для ўсіх дзяржаўных органаў. У такім выпадку пры праверцы дакументаў на мытні аўтаматычна ідзе запыт у патрэбныя ведамствы і праверка. У выніку чаго мытны інспектар прымае рашэнне, ці неабходна далей кантраляваць гэты груз або адпускаць». Міністр прывёў прыклад Сінгапура: «Там 90% усіх дэкларацый апрацоўваецца цягам 10 хвілін у аўтаматычным рэжыме». Прадстаўнік гэтай краіны Джонатан Кох пацвердзіў, што сістэма «адзінага акна» значна спрашчае працу. Дзякуючы гэтаму на рынак вельмі проста патрапіць. Аднак, калі ты некага падманеш, будзеш сябе паводзіць нядобрасумленна, адказнасць будзе самай жорсткай: «Мы вырашылі, што бізнесу трэба давяраць. Аднак праверак ніхто не адмяняў. Калі мы знаходзім хаця б маленькія парушэнні, то падманшчык атрымлівае вельмі высокія штрафы».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

# БАНКРУЦТВА «ДЫВАНОЎ БРЭСТА»: ФІНАЛ ЦІ ПАЧАТАК НОВАГА ЭТАПУ?

**Некалі вядомае на тэрыторыі ўсяго Савецкага Саюза прадпрыемства «Дываны Брэста» перажывае глыбокі крызіс. Праблемы на вытворчасці пачаліся яшчэ ў 90-х гадах, калі прадпрыемства ўзяло вялікі валютны крэдыт, а разлічыцца своечасова не здолела, і даўгі пачалі нарастаць. Назапашваліся не толькі запазычанасці па плацяжах, але і гатовая прадукцыя на складах.**

Некалькі разоў на прадпрыемстве і ў «калідорах улады» распрацоўваліся праграмы па выхадзе з крызісу, складаліся бізнес-планы, пад іх выдаткоўваліся сродкі. Але пераламаць сітуацыю карэнным чынам так і не ўдалося.

Апошні раз летась прадпрыемству выдзелілі 80 мільярдаў рублёў з бюджэту на мадэрнізацыю вытворчасці. На гэтыя грошы было набыта новае абсталяванне, тэхналогіі, праведзена работа па стварэнні сістэмы закупак сыравіны. Але на сёння «Дываны Брэста» зноў маюць крэдыторскую запазычанасць у суме 26 мільярдаў рублёў, банкаўскую — 87 мільярдаў.

На пазачарговым сходзе акцыянераў, у якім бралі ўдзел прадстаўнікі кіраўніцтва аблвыканкама і канцэрна «Беллегпрам», вырашылі распачаць працэдуру банкруцтва. Далейшы лёс былога прамысловага гіганта павінен вырашаць эканамічны суд Брэсцкай вобласці. Суд жа і вызначыць: патрэбна санацыя ці ліквідацыя прадпрыемства.

За апошняе дзесяцігоддзе на ААТ памяняліся чатыры кіраўнікі. Цяперашні дырэктар «дывановага» прадпрыемства Леанід Шолкавы лічыць, што санацыя — гэта значыць, аздараўленне завода — цалкам магчымае. Паводле яго слоў, апошнім часам была праведзена велізарная работа па мадэрнізацыі вытворчасці, якая можа стаць асновай аздараўлення эканомікі. Цяпер трэба чакаць рашэння суда.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Ініцыятывы

# ПРАДАЎ СПІРТНОЕ ПАДЛЕТКУ — РАЗВІТАЙСЯ З ЛІЦЭНЗІЯЙ

**Міністэрства ўнутраных спраў выступіла з ініцыятывай забараніць прадаваць алкаголь маладым людзям да 21 года.**

«Мы настойліва будзем рэкамендаваць дазволіць продаж спіртнога з 21-гадовага ўзросту, — адзначыў міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч. — Гэта звязана з тым, што з 18 да 21 года на ўлік у наркадыспансер ставіцца ў 15 разоў больш людзей, чым да 18-гадовага ўзросту». У выпадку паўторнага продажу спіртнога падлеткам прапануецца пазбаўляць гандлёвыя кропкі, індывідуальных прадпрымальнікаў ліцэнзіі. Акрамя таго, ёсць верагоднасць, што ў законе аб правах дзіцяці з'явіцца норма, якая забараняе спажываць моцны алкаголь, слабаалкагольныя напоі і піва да 18 гадоў. Адказнасць за ўжыванне алкаголю непаўналетнімі кіраўніцтва МУС прапаноўвае ўскласці на іх бацькоў. Неабходна, лічыць Ігар Шуневіч, таксама ўвесці абавязковую дактыласкапічную рэгістрацыю тых падлеткаў, якія стаяць на ўліку ў міліцыі або здзейснілі правапарушэнне. Ініцыятывы МУС разгледзяць ва ўрадзе ў красавіку.

**Надзея ПАЎЛАВА**

# ХТО ЎЗЫДЗЕ НА ТЭЛЕВІЗІЙНЫ АЛІМП?

**Да канца прыёму заявак на X Нацыянальны тэлевізійны конкурс «Тэлевяршыня» застаўся ўсяго тыдзень. Да 1 сакавіка 2014 года ў Міністэрстве інфармацыі (220004, г.Мінск, пр. Пераможцаў, 11) ад рэспубліканскіх, сталічных і рэгіянальных тэлекампаній і аб'яднанняў рознай формы ўласнасці прымаюцца работы, што выйшлі ў эфір цягам мінулага года.**




**Прадзюсарская група конкурсу «Міс Беларусь» атрымала ўзнагароды на IX «Тэлевяршыні».**

Потым пачнецца найбольш адказны этап: журы, у склад якога, па традыцыі, уваходзяць вядомыя рэжысёры, акцёры, сцэнарысты і журналісты, абярэ з усіх кандыдатаў па 3 фіналісты ў кожнай намінацыі. Усяго ж намінацый — 25, уключаючы 11 «асабістых» (лепшы прадзюсар, рэжысёр, вядучы праграм розных жанраў), 4 спецыяльныя прэміі для рэгіянальнага тэлебачання і Гран-пры «Тэлевізійны праект года».

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў юбілейнай «Тэлевяршыні», як плануецца, адбудзецца ў Мінску ў другой палове красавіка гэтага года і будзе транслiравацца ў эфіры аднаго з цэнтральных тэлеканалаў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Неасабісты суб'ектыў

# Гаркаваты смак суніц



## «Пасіўным носьбітам» беларускай мовы прысвячаецца

**Сярод любімых кніг, якія вандравалі са мной па ўсіх інтэрнацкіх пакоях ды здымных кватэрах, ёсць адна дзіцячая — Васіль Вітка. «Дом, дзе жывуць словы». Яе мне амаль дваццаць гадоў таму падарыў сам Цімох Васільевіч, напісаўшы на форзацы: «Дабрадзейцы і руплівіцы роднага слова». Я тады, помню, вельмі моцна гэтым ганарылася: вядомы і любімы з таго часу, як навучылася чытаць, пісьменнік адрасаваў такія словы студэнтцы... Павінна было прайсці амаль дваццаць гадоў, каб прыйшло разуменне: то быў... не, нават не вялікі аванс. Хутчэй — запавет і пажаданне сапраўднага дабрадзея і рупліўца роднай мовы, які на схіле жыцця спадзяваўся і верыў, што знойдуцца сярод маладых яго паслядоўнікі.**

Я каторы раз перачытваю тую дзіцячую кнігу — з задавальненнем і захапленнем: крамяныя родныя словы нанізваюцца на пацеркі гумарных і запамінальных вершаў. А ў аўтарскай прадмове ёсць такія радкі: «Па абыходжанні са словам мы пазнаём нашага субяседніка — цікавы гэта чалавек, багаты душою, адметны спосабам свайго мыслення ці ўбогі, абыякавы і глухі да душэўнай чуйнасці іншых людзей»... І, шчыра кажучы, не ведаю, ці магу сябе аднесці без сумненняў да першай катэгорыі. Бо, калі аналізаваць стаўленне да роднага слова і абыходжанне з ім (у маім і яшчэ шасцідзесяці працэнтаў суайчыннікаў, якія падчас апошняга перапісу насельніцтва ў 2009 годзе назвалі роднай мовай беларускую, выпадку маецца на ўвазе менавіта беларускае слова), карціна атрымліваецца не вельмі вясёлая. Так, падчас перапісу мы задэкларавалі сваё стаўленне да беларускай мовы, назваўшы яе роднай. А што далей?

А далей мы, у большасці сваёй, як правіла, пераключаемся ў лепшым выпадку — на другую дзяржаўную, у горшым — на «трасянку» (дарэчы, апошняя настолькі актыўна прыжываецца і «размнажаецца» ў нашым грамадстве, што гучаць ужо цалкам сур'ёзныя прапановы яе ўзаконіць. Глядзіш, пойдзе так далей — і «твой тытунь дрань, трапкай пахне» стане не фразай з анекдота, а прыкладам з падручніка).

Чаму мы так робім? Хтосьці «высакародна» прыкрываецца словамі паэткі: маўляў, «той, хто любіць папраўдзе, той ціха слова роднае ў сэрцы спяліць», узяўшы за аснову слова «ціха». Хтосьці мовы элементарна саромеецца, дагэтуль прытрымліваючыся стэрэатыпу, што яна паказальнік «несучаснасці», «вясковасці» (прычым у большасці сваёй гэта самі вяскоўцы ці жыхары невялікіх райцэнтраў). Хтосьці ўзводзіць гэта ў ранг «праблемы дзяржаўнага маштабу», чакае адпаведных дырэктыў, загадаў і г.д., нібы для таго, каб загаварыць на роднай мове ў краіне, дзе гэтая мова мае законны статус дзяржаўнай, патрэбны нейкі загад, акрамя ўласнага сумлення. А спытайся ў нас пры ўсім гэтым, ці любім мы мову, якую называем роднай, ці ведаем яе, амаль кожны, не задумваючыся, адкажа: «Безумоўна!»... Вось такія, шаноўны Цімох Васільевіч, з нас сёння нягеглыя «дабрадзеі і рупліўцы» атрымаліся.

І гэта пры тым, што, як сцвярджаюць навукоўцы-лінгвісты, больш як дзевяноста пяць працэнтаў жыхароў Беларусі «пасіўна валодаюць» беларускай мовай. Прычым галоўнае тут слова «пасіўна». Што з гэтага атрымліваецца? У інтэлектуальнай гульні на беларускім канале пытанні з вобласці беларускай мовы (прычым пытанні элементарныя, кшталту «Што такое па-беларуску «шпалеры»?») атрымліваюць пяты-шосты ўзровень складанасці, прычым пры наяўнасці чатырох варыянтаў, адзін з якіх правільны, чалавек дзесяць у зале, а з імі нярэдка галоўны ігрок пад кпіны вядучага памыляюцца. А ў патрыятычным тэлевізійным шоу — цікавай, пазнавальнай перадачы — конкурс «Родная мова» ператвараецца час ад часу ў нешта падобнае на экзамен для мігрантаў на самае спрошчанае веданне мовы краіны, у якой яны збіраюцца жыць. Гледзячы, як нашы «зоркі» радасна пляскаюць у ладкі і скачуць ад радасці, калі ўдаецца правільна прадыктаваць па літарах беларускае слова ці ўспомніць, як называецца па-беларуску нейкі прадмет, не ведаеш, смяяцца разам з імі ці плакаць ад прыкрасці.

Як, дарэчы, і ў дачыненні да самой сябе. Улетку каля станцыі метро ўбачыла, як на біг-бордзе мянялі плакат. Пакрысе з'яўляліся буйныя чырвоныя ягады і надпіс: «Смак роднай мовы. Суніцы». І адразу стала хораша на душы, бо павеяла цёплым ветрыкам першага дня школьных канікул, успомнілася адчуванне цёплай роснай травы пад нагамі, прымроіўся пясчаны пагорак на старым кургане, увесь у чырвоных крапельках духмяных салодкіх ягад, якія можна есці цэлай жменяй, збіраючы і высыпаючы проста ў рот. І ўсплыла ў памяці дзіцячая «замова», што паўтарала заўсёды па дарозе да тых курганоў: «Сунічкі-сунічкі, гарлачык невялічкі. Сыпцеся роўна, тады будзе поўна...» Гэтыя прыемныя думкі ды асацыяцыі перабіў водар сапраўдных спелых ягад — побач з тым бігбордам кабеты з недалёкіх ад сталіцы вёсак прадавалі ўсё, што вырасла на агародзе і ў лесе. «Почем земляника?» — яно, клянуся, вырвалася само... Не хацелася, ведаеце, звяртаць на сябе лішнюю ўвагу. А можа, проста падсвядома хацела паказаць тым цёткам, хто тут больш «гарадскі». Дый наогул не было такога загаду ці закону, каб па-беларуску гаварыць...

... Я не ведаю, якую мову назвала сваёй роднай у перапісным лісце гераіня апошняга тыдня Даша Домрачава, якая палову жыцця правяла ў суседняй краіне. А яно і няважна. Нашмат важней іншае, тое, што бачыў увесь свет. Усе тры разы, стоячы на самай высокай прыступцы алімпійскага п'едэстала, наша чэмпіёнка спявала гімн. Выразна і ўпэўнена вымаўляючы беларускія словы — ад пачатку да завяршэння музыкі.

Пытанне на засыпку нам з вамі, шаноўныя пасіўныя носьбіты. Не хвалюйцеся, не пра тое, ці маглі б вось так — па-беларуску, пад сотнямі тэле- і фота камер, на ўвесь свет. Гэта будзе, напэўна, занадта. Таму давайце, толькі шчыра, адкажам на прасцейшае: ці многія з нас ведаюць словы роднага гімна, якія, вядома ж, на роднай мове?...

Ці мы, як казаў герой славутага фільма, мову любім «у глыбіні душы, дзесьці вельмі глыбока»...

Так глыбока, што ўспомнім аб гэтай любові толькі падчас наступнага перапісу?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

# СЁННЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

## Дыктоўкі, вечарыны і проста размовы з сябрамі

Мова — ці не самая першая прыкмета таго, што ёсць народ, што ён асаблівы. І што ён усведамляе сваю асаблівасць, непаўторнасць, узбагачаючы свет сэнсам, які адкрыты менавіта яму. Таму сэнс гэтага дня — засведчыць: мы ёсць, мы тут, мы хочам развіваць сваю культуру.

Таму ў Беларусі гэты дзень — 21 лютага — мае сваё асаблівае напаўненне. Кожны год, вядома, бывае па-рознаму. Але сёлета моўныя акцэнты выстаўлены ў двух кірунках.

**Першы.** Беларуская мова для нас саміх, жыхароў краіны пад назвай Беларусь. Спробы яшчэ раз звярнуць людзей да роднай мовы, даць магчымасць паслухаць і адчуць, як непаўторна яна можа гучаць. Нават можна праверыць сябе, наколькі добра мы ёй валодаем. Дзеля гэтага, напрыклад, Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны ўвяло практыку правядзення агульнанацыянальных дыктовак. Сёлета ў Міжнародны дзень роднай мовы гэтая акцыя пройдзе сёмы раз. Прычым не толькі ў Беларусі, але і ў розных кутках свету.

**Другі.** Менавіта ў тым, як беларуская мова гучыць у свеце (бо ў нейкім сэнсе гэта паказчык таго, як за межамі нашай краіны прымаюць беларускую культуру). І тое, што дыктоўка праходзіць не толькі ў Беларусі, — факт радасны. Але не толькі ён.

Беларуская мова «У дыялогу культур» — гэта тэма літаратурна-музычнага вечара, які сёння адбудзецца ў Дзяржаўным літаратурным музеі імя Янкі Купалы. Цікава, што гасцямі гэтай імпрэзы стануць дыпламаты розных краін, якія працуюць у Беларусі. У доме народнага паэта Беларусі Янкі Купалы яны паслухаюць вершы і песні на беларускай мове. Але яшчэ і самі пачытаюць вершы Купалы ў перакладзе — на сваіх родных мовах. Насамрэч ва ўмовах тэндэнцыі да большай адкрытасці культур і іх збліжэння для кожнага народа становіцца ці не першаснай культурная задачай — захаванне нацыянальнай адметнасці праз мову. Таму і дзень гэты абвешчаны такой міжнароднай арганізацыяй, як ЮНЕСКА. І ўсе дзяржавы, якія з'яўляюцца членамі гэтай арганізацыі, далучаюцца да свята і імкнуцца засведчыць пра свае народы праз словы і данесці галоўны сэнс: мы ёсць!

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

■ Медыяпрастора

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Брэст** | **106.6 FM** | | |
| **Віцебск** | **101.8 FM** | **Бабруйск** | **103.6 FM** |
| **Мінск** | **107.1 FM** | **Баранавічы** | **98.4 FM** |
| **Гродна** | **104.2 FM** | **Салігорск** | **104.3 FM** |
| **Магілёў** | **107.8 FM** | **Пінск** | **103.2 FM** |

## СМЕШНЫЯ НАВІНЫ

Кожны дзень у эфіры радыё «Мір» можна пачуць пяць смешных навін ад Юрыя Царова. Цяпер уся ўвага грамадства прыкавана да Алімпіяды, і ў нашым эфіры — апошнія навіны з Сочы: «Неасцярожны рэпарцёр заняў трэцяе месца па бабслеі», «Канькабежац з Руанды вярнуўся дадому з залатым медалём. Зараз з ім працуе паліцыя», «Скептыкі ўпэўнены, што зборную Кітая на Алімпіядзе замяняе адзін і той жа спартсмен», «Рашэннем спартыўнай камісіі язда на маршрутках прызнана экстрэмальным відам спорту»... і шмат чаго іншага, пра што вам не раскажуць спартыўныя выданні і сур'ёзныя тэлекаментатары! На свет мы глядзім з усмешкай!

«Смешныя навіны» — настройвайцеся на хвалю гумару і пазітыву штодня ў 16.45!

TV@R

Антон МАРТЫНЕНКА:

# «Я — ЗВАР'ЯЦЕЛЫ БІБЛІЯФІЛ»



**Ёсць людзі вядучыя, а ёсць вядзёныя. Антон Мартыненка з ліку першых. Абаяльны, з пачуццём гумару і бязмернай любоўю да кніг. Такі сабе ахвотнік будаваць сваё жыццё, арыентуючыся на ўласныя жаданні. Аднак і парады іншых часам выкарыстоўвае. Неяк адзін з выкладчыкаў агучыў думку, быццам «інтэлігентны і выхаваны чалавек павінен ведаць сотню вершаў», і Антон вывучыў... Пры сустрэчы вядучы ток-шоу «Такі лёс», праектаў «ХОРоШОУ» і «У тым жа месцы ў той жа час» на тэлеканале СТБ , а таксама «Вячэрняга шоу» на радыё «Юністар» расказаў пра жыццёвыя кантрасты, ролю кніг у сваім жыцці і вынік пошукаў месца пад сонцам.**

***— Якім вы памятаеце сябе 20 гадоў таму?***

— Гэта мне сем гадоў было... Памятаю, маці заўжды казала, што я быў вельмі непераборлівым. Ніколі не патрабаваў сабе нейкіх неверагодных падарункаў. У мяне была любімая цацка — канструктар «Лега», і калі нават на кожны дзень нараджэння мне куплялі новы, то большага шчасця для мяне і не існавала. Праўда, і такі падарунак быў зусім не танным. Наогул «Лега» і казкі Пушкіна — вось усё, што патрэбна для выхавання нармальнага дзіцяці. Я вам як філолаг кажу.

***— А потым вы зацікавіліся радыё...***

— Не, потым я адкрыў у сабе любоў да чытання. І кнігі сталі маімі спадарожнікамі па жыцці. Знайшоў дома неяк кнігу «Прыгоды барона Мюнхгаўзена» — яна была ў мяккай вокладцы, фармату часопіса і з карцінкамі. І той твор настолькі мяне ўразіў, што я перачытаў усе кнігі ў доме. З таго часу чытаю заўсёды, хаця не вельмі прыязна стаўлюся да кнігі ў якасці падарунка.

***— Чаму?***

— Не ведаю, праўда. Вельмі люблю кнігі. Нават на філалагічны пайшоў мэтанакіравана. А вось падораную кнігу ўспрымаю не заўсёды станоўча. Вельмі рэдка людзі дораць добрыя кнігі. Звычайна ў падарунак выбіраюць тыя, якія на кніжных паліцах займаюць месца бестселераў, а яны часта прывабныя толькі яркай вокладкай. Я рэдка бачыў удалы выбар. Лічу, што добрыя кнігі чалавек сам сабе набывае, бо для кожнага з нас такая кніга ў розны час свая.

***— Для вас ёсць розніца — папяровая кніга ці электронная?***

— Абсалютна спакойна чытаю на айпадзе і не замарочваюся наконт папяровага варыянту. Мне рыдар цудоўна замяняе ўсе кнігі. Куды больш камфортна адчуваю сябе, калі магу недзе знайсці спасылку ці рэкамендацыю цікавага твора, а потым за лічаныя секунды спампаваць яго і пачаць чытаць. Для такіх, як я, звар'яцелых бібліяфілаў, інтэрнэт — проста велізарны басейн для дэльфіна.

***— Што любіце чытаць?***

— Вельмі розную літаратуру. Напрыклад, Стывена Хокінга, якога не ўдаецца пакуль зразумець, але я не пакідаю спроб. Быў у мяне перыяд, калі ва ўніверсітэце вучыў на памяць «Яўгена Анегіна», і кніга за чатыры гады проста пачала развальвацца. Некаторыя выкладчыкі рабілі заўвагі: маўляў, нельга так ставіцца да кнігі. А я адказваў, што ўпэўнены, Пушкіну было б прыемна бачыць, як яго кнігу зачытваюць да дзірак і яна не пыліцца недзе на паліцы гадамі.

***— Як жа апынуліся на радыё і тэлебачанні?***

— Ёсць навокал працэнтаў 90 людзей, якія не ведаюць, чым займацца ў жыцці, і такая з'ява нармальная. Ідэальны спосаб праверыць, ці займаешся ты сваёй справай, — адказаць сабе на пытанне: «Ці змог бы я займацца гэтым бясплатна?» Я, можна сказаць, таксама быў чалавекам, які шукаў такі занятак для сябе. Неяк са стрыечнай сястрой завялі пра гэта размову. Я ёй сказаў, што было б цікава на радыё папрацаваць. Тады якраз я наведваў тэатральную студыю «На балконе», якая знаходзіцца побач з радыё «Юністар».

**Наогул «Лега» і казкі Пушкіна — вось усё, што патрэбна для выхавання нармальнага дзіцяці.**

Нікога там асабіста не ведаючы, я быў прыхільнікам гэтай радыёстанцыі. Чуў пра Дзмітрыя Шэпелева, які там працаваў. Таму падумаў, калі і спрабаваць, то ісці трэба толькі туды. Спачатку патэлефанаваў на радыё, а потым прыйшоў і пачаў шукаць чалавека, які дыджэямі ў іх займаецца. Сустрэліся з ім, змадэлявалі мінімальны эфір у студыі. А пасля мы з Юляй (жонка Антона. — **Аўт.**) паехалі працаваць у піянерскі летнік. Адказу з радыё не было месяцы тры-чатыры, а потым мяне паклікалі, каб праслухаць яшчэ раз. І на той сустрэчы далі зразумець, што я, можа, і буду працаваць там, а можа, і не варта спадзявацца на гэта. Мяне такая рэакцыя здзівіла. Першы час у працы адчуваў пэўнае супрацьстаянне... Але былі і людзі, якім падабалася тое, што я раблю.

Праз нейкі час з'явілася ў маім жыцці тэлебачанне. На адну з праграм на тэлеканал «Мір» запрасілі ў якасці госця, а потым вядучая праграмы сыходзіла ў дэкрэт і парэкамендавала мяне. Запісалі мы там тры выпускі, і нечакана мяне паклікалі на СТБ. Быў кастынг на ток-шоу «Такі лёс». Адтуль патэлефанавалі праз пару месяцаў і запрасілі на відэапробы. Апынуўся перад камерай з Кацярынай Забянько, і пачалася мая гісторыя на СТБ.

***— Адразу знайшлі агульную мову?***

— Момант прыціркі быў, але не магу сказаць, што ён праяўляўся неяк ярка і галосна. Мы ніколі не сварыліся. Толькі часам абмяркоўвалі нейкія моманты працоўнага працэсу, бо здаралася несупадзенне пунктаў гледжання. Напрыклад, выпадкі, калі я атакую госця праграмы пытаннямі, і ён ужо амаль расказвае тое, чаго я дабіваюся, і тут Каця задае сваё пытанне, пасля якога мне ўжо складана зноў вывесці чалавека на тыя ж эмоцыі. У такіх сітуацыях я ўсё ж выказваю сваю пазіцыю незадаволенасці, бо сяброўства сяброўствам, а ў стварэнні прадукту я патрабавальны як да сябе, так і да іншых.

***— А самі глядзіце тэлевізар?***

— Я, мабыць, першы прыхільнік тэлебачання. Увесь час гляджу нейкія праграмы. Пачынаючы з «Бітвы экстрасэнсаў» і «Дома 2» і заканчваючы каналам Euronews. І перадачы, і фільмы. Не люблю толькі фантастыку. Прычым як на экране, так і ў літаратуры. Хоць добра разумею, фантастыка бывае розная. Але такі вось у мяне пункцік.

***— Працаваць у дуэце вам падабаецца?***

— У кожнай праграмы свой фармат. На радыё «Юністар» я спасціг навуку, што трэба заўсёды памятаць, з якой аўдыторыяй гаворыш. Таму я не стаў бы акцэнтаваць увагу на тым, працуеш ты ў пары ці сольна. Галоўнае — памятаць, для каго працуеш. З Кацярынай Забянько мы робім ток-шоу для пэўнай колькасці людзей, якія наогул не перасякаюцца са слухачамі радыё. Маючы магчымасць ахопліваць такую розную аўдыторыю, я адчуваю адказнасць перад ёй. Хоць не кажу, быццам гэта складана. Бо, напрыклад, адпрацаваўшы паўгода токарам на заводзе, ведаю смак па-сапраўднаму цяжкай працы. Усё наогул пазнаецца ў параўнанні. Мая праца цікавая, але мае свае спецыфічныя моманты, якія варта ўлічваць.

**Адпрацаваўшы паўгода токарам на заводзе, ведаю смак па-сапраўднаму цяжкай працы.**

***— Вы самакрытычны чалавек?***

— Баюся, што такое вызначэнне не пра мяне. Ролю крытыкаў выконваюць мае блізкія. Апошнія тры-чатыры гады — жонка. Здаецца, яна крытыкуе вельмі жорстка, бо ведае: я часам не адчуваю берагоў і лепш адразу мяне вярнуць да рэальнасці, каб у наступны раз такога не паўтараў. Мне ж часта здаецца, быццам я раблю нешта класнае, а аказваецца — нярэдка памыляюся.

***— Значыць, ваша пазіцыя па жыцці — няспынны пошук?***

— Я сказаў бы, што гэта не пошук, а, хутчэй, інтарэс да ўсяго. Неяк ва ўніверсітэце на філасофіі нам прывялі прыклад з Сакрата, які казаў: «Я ведаю, што не ведаю нічога». І выкладчыца тады сказала: «Вашы веды — гэта маленькае кола. І яго памер павялічваецца толькі тады, калі вы даведваецеся нешта новае. Але, чым больш дазнаешся, тым большымі становяцца маштабы нязведанага».

**Алена ДРАПКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 24 ЛЮТАГА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05 Камедыя «Пяць нявест».**
**12.10** Клуб рэдактараў.
**12.55** Нашы.
**13.10 Кінараман «Афіцэры».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Баявік «Тры ікс 2: Новы ўзровень».**
**17.15** БеларусьLIFE.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».**
**23.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.
**0.20 Баявік «Адчайны».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.55** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «План Б».**
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45, 23.50 Серыял «Людзі Шпака».**
**11.55 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**13.55** Пад грыфам «Вядомыя».
**14.30 Камедыя «Мільянер паняволі».**
**16.20, 23.10** Ток-шоу «Перазагрузка».
**17.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**19.00 Серыял «Чкалаў». 1-я — 3-я серыі.**
**21.45** КЕНО.
**22.00 Серыял «Інтэрны».**
**0.45** Дак. фільм «Спыніся!».

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 11.30, 19.35, 0.10** «Калейдаскоп».
**8.05, 11.40, 0.15** «Год у гісторыі».
**8.20** «Карані».
**8.50** «Майстры і чаляднікі». Ткачыхі.
**9.20** «Наша спадчына». Кармянская святыня.
**9.35, 20.50 Серыял «Мегрэ».**
**10.20, 21.45** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.45, 19.45 Серыял «Доктар Жывага».**
**11.55, 23.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці дырыжора, народнага артыста Беларусі Юрыя Яфімава.
**12.25** «Скарбніца Гарадзеншчыны». Харальная сінагога ў Гродне.
**12.55** «Цуды прыроды».
**13.20** «Паром». Кароткаметражны фільм.
**14.00** «На беразе ракі Фантанкі». Дак. фільм.
**14.35** «Гісторыя аднаго горада». Дак. фільм пра мінулае горада Мінска.
**15.00** «Музеум». Партрэты сям'і Весялоўскіх.
**15.15** Канцэрт Дзяржаўнага камернага аркестра Рэспублікі Беларусь. Саліст — народны артыст Расіі Фрыдрых Ліпс.
**16.50** «Наперад у мінулае».
**17.15** «Росчырк часу».
**17.30** «Кінаіндустрыя Краіны Саветаў».
**18.25** «Палескі пачастунак». Запяканка «па-берасцейску».
**18.40** «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Лебядзіны Мох-Патокі».
**19.10** «Камертон». Хор Турэцкага.
**20.30** Калыханка.
**22.15 «Гарачыя дзянёчкі». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.10** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Дзённік.
**7.30** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Урачыстая цырымонія закрыцця.
**10.05** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Хакей. Фінал. Мужчыны.
**13.10** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Біятлон. Эстафета. Мужчыны.
**14.55** Футбол. Жараб'ёўка адборачнага турніру ЧЕ-2016.
**15.55** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Лыжны спорт. Гонка з масавым стартам. Мужчыны.
**19.15** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Бабслей. Мужчыны. Чацвёркі.
**21.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Норвіч» — «Тотэнхэм».
**23.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.55** Авертайм.
**0.25** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Астана» — «Цмокі-Мінск».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.10** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Іосіф Лангбард. Драма архітэктара». Фільм другі.
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** III Міжнародны фестываль «Уладзімір Співакоў запрашае!». Канцэрт Дзмітрыя Хварастоўскага.
**23.35 Маст. фільм «Асноўны інстынкт».**
**1.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** СТБ-спорт.
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.25** «ХороШоу». Паўфінал. «Пра што спяваюць жанчыны».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.25** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.35** «Іншая краіна». «Жывелі, Сербія?».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Ежа багоў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** Дзённік «ХороШоу».
**20.20 Маст. фільм «Крыжаваны агонь».**
**22.15** «Глядзец усім!».
**23.00** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**7.15** Беларусь сёння.
**8.15 Маст. фільм «Турэцкі гамбіт».**
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «У свеце мінулага».
**15.20, 23.40** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10 Серыял «Монтэкрыста».**
**18.20 Серыял «Маўклівы сведка».**
**21.20 Серыял «Чорны крумкач».**
**23.10** «Беларусь сёння».
**0.30** «Агульны інтарэс».
**0.55 Серыял «Хакейныя гульні».**
**2.35 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**4.20** «Беларусь сёння».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.40** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Аркадзь Кашко. Геній рускага вышуку».
**15.35** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55 Серыял «Я прыйду сама».**
**20.45 Серыял «Дом каля вялікай ракі».**
**21.45 Серыял «Гюльчатай. Дзеля кахання».**
**23.50 Серыял «Тайны следства».**
**0.40** «Песня застаецца з чалавекам. Аркадзь Астроўскі».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».**
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35 Маст. фільм «Вяртанне».**
**1.15 Серыял «Паверх».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 11.35, 19.00, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**7.10 Драма «Халоднае лета 53-га».**
**8.50, 17.50 Серыял «Налёт».**
**9.50** «Сінематограф». «Шукальнікі прыгод».
**11.40 Драма «Прага хуткасці».**
**13.25 Дэтэктыў «Ілюзія палёту».**
**15.05 Серыял «Штрафбат».**
**16.00** Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Гімнасткі».**
**19.05 Серыял «Дракула».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Трылер «Госця».**
**23.00 Серыял «Горад мары».**

### ВТБ

**6.00, 0.30** "PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.00, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00 Серыял «Сваццfolk».**
**10.00** «Яда па правілах і без».
**11.00** «Шчасце без ахвяр».
**12.00, 18.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**13.00, 23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Скетч-шоу «ВалераТБ».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Камедыя «Вялікі Стэн».**
**19.00 Серыял «Святлафор».**
**20.00 Серыял «Выжыць пасля».**
**21.10 Меладрама «Пастка для нявесты».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 0.40** «Наглядальнік».
**10.15 Серыял «Пэры Мэйсан».**
**11.10** Дак. фільм «Антонія Сальеры».
**11.20** «Лінія жыцця». Ігар Залатавіцкі.
**12.15** Дак. серыял «Цуды жыцця». 1-я серыя.
**13.10 Серыял «У лясах і на гарах».**
**14.10** Спадчыннікі Гіпакрата. «Мікалай Бурдэнка. Падзенне ўверх».
**14.35 Маст. фільм «Суvotaраў».**
**16.20** Канцэрт Каралеўскага аркестра Канцэртгебау.
**17.10** «Паліглот». Нямецкая з нуля за 16 гадзін! № 5.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** «Сацці. Нясумная класіка...».
**19.15** «Правілы жыцця».
**19.45** «Астравы». Аляксандр Збруеў.
**20.25** «Тым часам».
**21.15** «Захаваны час. Некаторыя падрабязнасці Вялікай гісторыі».
**22.20** «Гай Юлій Цэзар». Дак. фільм
**22.50** «Кінескоп». «64-ы Берлінскі МКФ».
**23.30** Дак. камера. «Дзіцячы свет».
**0.10** С. Пракоф'еў. Канцэрт № 3 для фартэпіяна з аркестрам.
**1.35** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.05** «СевАлогія»: «Міжнародная панарама». 2005 год.
**6.10** «Пад знакам задыяка. Рыбы». 1992 год.
**7.45** «Музыка ў эфіры». 1993 год.
**9.00 «Наш амерыканскі Бора». Маст. фільм.**
**10.30** «Маскоўскія матывы». Фільм-канцэрт.
**11.00, 13.00** «Канцэрт да дня абаронцаў Айчыны». 1993 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**14.00** «Асаф Месерэр». Фільм-манаграфія.
**15.00** «Што? Дзе? Калі?». Фінальная гульня. 1982 год.
**17.00** С.У. Міхалкоў. «Усё пачынаецца з дзяцінства».
**17.55** «Музычны круіз». Фільм-канцэрт.
**18.25** «Брыдкая Эльза». Тэлеспектакль. 1981 год.
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Вечар песень кампазітара А.І. Астроўскага ў Калонай зале Доме Саюзаў». 1984 год. 1 частка.
**23.00** «Пад знакам «Пі». 1990 год.
**0.10** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
**0.45** «Марцін Ідэн». 3-я частка. Тэлеспектакль.
**4.00** «Кінапанарама». 1989 год.

### EUROSPORT

**10.30** Супербайк. Аўстралія.
**13.30, 22.00, 2.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса.
**20.00, 1.30** Футбол. Еўрагалы.
**21.00, 1.15** Футбол. Бразілманія.
**21.15** Дартс. Кубак нацый. Шатландыя.
**1.00** Вось гэта дзіва!!!
***3.30—10.30 Тэхнічны перапынак.***

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 2.20** Серыял «Старыя перцы».
**6.15** Камедыя «Дом з прыколамі».
**7.40, 8.45, 13.50, 16.45** «Камедыянты. Лепшае».
**8.00, 13.00, 16.00, 21.00, 21.50** Серыял «Бет!».
**9.00** Прыгоды «Вакол свету за 80 дзён».
**11.15** Камедыя «Атрад Беверлі Хілз».
**14.10** Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера».
**17.20** Камедыя «Шчырая размова».
**19.20** Камедыя «Будзьце як дома».
**22.10** Камедыя «Руганціна».
**0.10** Камедыя «Звычка жаніцца».
**3.25** Прыгоды «Дарога ў Занзібар».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.10** «Сардэчна запрашаем дамоў!».
**8.50, 18.30, 3.00** Серыял «Забароненае каханне».
**10.15** «Паненка і кухар».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.10** «Жонка. Гісторыя кахання». Людміла Чурсіна.
**14.30** «Сто пытанняў дарослаunion». Сяргей Гармаш.
**15.15, 23.55, 5.15** Серыял «Звышнатуральнае».
**20.10** Серыял «Леднікаў».
**21.10, 4.25** Серыял «Брыгада».
**22.15** Маст. фільм «Выходзь за мяне».
**0.40** Серыял «Абрынутыя нябёсы».
**1.25** «Часова даступны». Аляксандр Маслякоў.
**2.20** «Без падману».

### ТБ1000

**5.00** Трылер «Наркоз».
**7.00** Драма «Калі ты ў апошні раз бачыў свайго бацьку?».
**9.00** Баявік «Адзінаццаць сяброў Оўшэна».
**11.40** Баявік «Круты і цыпачкі».
**13.45** Трагікамедыя «Дзверы ў падлозе».
**15.40** Камедыя «Шалёныя грошы».
**17.30** Драма «Мы. Верым у каханне».
**19.00** Драма «Забароненае каханне».
**20.55** Драма «Небяспечны метад».
**22.40** Трагікамедыя «Жыццё цудоўнае».
**0.25** Камедыя «Тайны знак».
**2.10** Дэтэктыў «Перакладчыца».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Казка «Кароль-алень».
**7.30** Камедыя «2 дні».
**9.30** Драма «Легенда № 17».
**12.00** Драма «Мілы, дарагі, любімы, адзіны...».
**13.30** Драма «Агні прытона».
**15.40** Драма «Адмірал».
**17.50** Трагікамедыя «Міленькая».
**20.00** Баявік «Бой з ценем: Рэванш».
**22.20** Трагікамедыя «Навобмацак».
**0.20** Трагікамедыя «Аддаць канцы».
**2.15** Драма «Апошняя рэпрадукцыя».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
**6.00** Кіты-гарбачы.
**7.00** Дзікія жывёлы Поўначы.
**8.00, 13.00** Ліхтугі за мяжой.
**10.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**11.00** Стараццелі.
**12.00, 18.00** Цяжкае золата Аляскі.
**15.00** Каралева гіен.
**16.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.00, 23.00** Выратавальны атрад.
**20.00, 0.00, 3.00** Апакаліпсіс: узыходжанне Гітлера.
**21.00, 1.00, 4.00** Сканеры старажытнага свету.
**22.00, 2.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00** Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
**7.50, 13.15** Пешшу па Амазонцы.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Марпех Дуг.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Што было далей?
**12.20, 1.50** Сапраўдныя аферысты.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05, 6.05** Махінатары.
**16.00** Пятая перадача.
**16.25** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Пераломны момант.
**19.10** Сістэмы кіравання.
**21.00** Гульня на жыццё.
**22.00** Уцячы ад пагоні.
**23.00** Хлопцы з Юкана.
**0.00, 5.10** Цуды Сонечнай сістэмы.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

Асоба

Архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфан:

# «СУЧАСНАМУ ЧАЛАВЕКУ ТРЭБА ТРЫМАЦЦА ЗА ВЕРУ І ДОБРУЮ СЯМ'Ю»

**Першае, чым здзівіў мяне архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфан, — сваёй надзвычай прыгожай, сакавітай беларускай мовай. Аказалася, уладыка ведае і любіць класічную беларускую літаратуру, падчас гутаркі не раз прыводзіў вялікую колькасць вершаваных радкоў, не ўтойваў сваёй сімпатыі да творчасці Якуба Коласа. Высветлілася, што архіепіскап — даўні чытач нашай газеты. Да чытання «Звязды» прызвычаіўся ў школьныя гады, газету выпісвалі бацькі. Нават у арміі, у далёкай Туркменіі, атрымліваў беларускую газету, якую выпісала для яго сваячка. А сваіх настаўніц беларускай мовы, Таццяну Васільеўну Сакалову і Марыю Арцёмаўну Бурак, уладыка Стэфан і цяпер згадвае самымі лепшымі словамі.**

За адведзены для гутаркі час мы паспелі абмеркаваць асаблівасці палескага краю і палескай ментальнасці, а таксама некаторыя праблемы сучаснага грамадства. Асабліва непакояць архіепіскапа хібы ў сямейным выхаванні падрастаючага пакалення, недастаткова адказнае стаўленне да стварэння маладымі ўласнай сям'і, памяншэнне духоўнасці грамадства ў цэлым.

***— Шаноўны ўладыка, раскажыце, хаця б коратка, пра свой шлях да веры, да духоўнага служэння.***

— Родам я з Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. У маім дзяцінстве гэта быў адзін з самых бязбожных раёнаў Беларусі. На той час у ім не засталося ніводнай царквы. У адным нашым Смілавіцкім прыходзе было раней тры храмы, а ў 30-я гады іх зруйнавалі і знішчылі. Рабілі ндобрую справу не якія-небудзь прышэльцы, а свае ж вяскоўцы. Потым, як правіла, мы чулі пра іх незайздросны лёс. Вечарамі збіраліся аднавяскоўцы, успаміналі, як раней маліліся ў храме, адзначалі святы. У многіх традыцыі падтрымліваліся ў сем'ях, людзі захоўвалі абразы, у нядзелю не працавалі, вялікія рэлігійныя святы адзначалі па хатах. У царкву я ездзіў у Мінск ужо ў школьныя гады.

***— Бацькі накіроўвалі да Бога?***

— Зусім не. Бацькі прывівалі інтарэс да вучобы. А да Бога я прыйшоў сам. Пасля службы ў сталічным храме часта заходзіў у вялікую кніжную краму. Там на той час было шмат бязбожнай літаратуры — цэлыя паліцы. Але я прастойваў ля іх гадзіны паўтары-дзве і ўсё ж знаходзіў нешта патрэбнае для сябе. Некаторыя кнігі мне здорава памаглі, там была інфармацыя, што сеяла сумненні і будзіла цікавасць. Хацелася самому знайсці адказы на многія пытанні... Пасля сямігодкі паступіў у сельскагаспадарчы тэхнікум, вывучыўся на агранома і атрымаў накіраванне ў гаспадарку Пастаўскага раёна. У вёсцы жылі два старыя дзядкі, якія нейкім чынам мяне прыкмецілі, давалі чытаць рэлігійныя кніжкі. Вядома, употай. Потым тры гады адслужыў у войску, у Туркменіі. Вярнуўся дадому, зноў працаваў аграномам. А ў 1972 годзе паступіў у Маскоўскую семінарыю. Пасля семінарыі была акадэмія. Потым працаваў у Жыровічах, і вось ужо 24-ы год — у Пінскай епархіі.

***— Чым адрозніваецца епархія два дзесяцігоддзі таму і цяпер?***

— Калі я прыйшоў сюды на служэнне, у епархіі — гэта значыць, у васьмі раёнах вобласці — было 80 храмаў, цяпер іх амаль 180. Пабудавалі новыя альбо адрадзілі каля сотні цэркваў. Сёння ўжо не толькі ў гарадах, але і ў некаторых вялікіх сельскіх населеных пунктах па дзве царквы (у такіх, як Альшаны, Давыд-Гарадок). Як часта кажуць, прыйшоў час збіраць камяні, тыя, што параскідалі падчас бязбожжа, калі руйнавалі цэрквы. Цяпер вось збіраем. Праўда, на Палессі не столькі разбурылі і закрылі, як у цэнтральнай і ўсходняй Беларусі. Але і тут многае давялося збіраць, аднаўляць.

Радуе, што многія людзі пацягнуліся да веры, што адпраўляюць дзяцей у нядзельныя школы. А дзеці-слухачы нашых школ, бывае, потым бацькоў агітуюць прыйсці ў храм і запоўніць прабелы ў рэлігійных ведах. Самыя першыя наведнікі нядзельнай школы ўжо самі сталі бацькамі і прыводзяць сюды дзяцей. Усяго па епархіі лік такіх школ набліжаецца да ста. Прыемна, што некаторыя дарослыя адчулі патрэбу ў духоўнай асвеце. Пры нядзельнай школе жаночага манастыра ў нас утварылася група дарослых слухачоў, якія ходзяць на заняткі. Дарослыя групы цяпер ёсць пры храмах амаль усіх райцэнтраў.

***— Апошнім часам шмат гавораць і пішуць пра сацыяльнае служэнне праваслаўнай царквы. Якія самыя значныя справы на гэтай ніве робяцца ў вашай епархіі?***

— У Святой Волі Івацэвіцкага раёна служыць айцец Мікалай, вялікі энтузіяст стварэння прытулку для тых, хто па розных прычынах яго не мае. У вёсцы ўзводзіцца дом, дзе змогуць атрымаць дах над галавой, кавалак хлеба і слова спагады тыя, хто мае ў гэтым вострую патрэбу.

**Радуе, што многія людзі пацягнуліся да веры, што адпраўляюць дзяцей у нядзельныя школы. А дзеці-слухачы нашых школ, бывае, потым бацькоў агітуюць прыйсці ў храм і запоўніць прабелы ў рэлігійных ведах.**

А ў Пінску вядзецца вялікая работа па падрыхтоўцы да ўзвядзення цэнтра сацыяльнай дапамогі. Тут запланавана размясціць дзіцячы хоспіс, аддзяленне рэабілітацыі, прытулак для старых. Нельга сказаць, што названыя ўстановы давядзецца пачынаць з нуля. Дапамогай хворым, адзінокім, абяздоленым праваслаўныя святары і вернікі займаліся і да гэтага, толькі ў розных месцах горада, у розных прыходах. Цэнтр жа дазволіць «звесці» добрую справу ў адно месца і пашырыць нашы магчымасці. У агульным цэнтры нават хворыя людзі змогуць адзін аднаго падтрымліваць. Сюды стане магчымым



залучаць больш валанцёраў, асабліва з ліку моладзі. Гэтай дзейнасці кіраўнік аддзела сацыяльнага служэння епархіі айцец Сергій надае асаблівае значэнне. Пінск — маладзевы горад, тут працуе ўніверсітэт, ёсць цэлы шэраг сярэдніх навучальных устаноў. Вельмі важна да добрай справы прыцягнуць як мага больш моладзі. Калі хлопцы і дзяўчаты прыйдуць папрацаваць у цэнтр, яны атрымаюць на ўсё жыццё бясцэнныя ўрокі спагады, міласэрнасці, цярпення. Гэта хоць крышачку дапаможа ім у далейшым стаць добрымі бацькамі, свядомымі грамадзянамі сваёй краіны.

Вялікая бяда нашага грамадства ў тым, што занадта шмат бацькоў не займаюцца выхаваннем дзяцей. Дзеці растуць самі па сабе. А бацькі, знаходзячы апраўданне ў сваёй вялікай занятасці, адкупляюцца ад дзяцей дарагімі цацкамі, такімі, як камп'ютар. І што атрымліваецца? Дзіця не развіваецца, не думае, за яго думае машына. Цяпер стала амаль што нормай, калі з камп'ютара спісваюць сачыненні, выконваюць такім чынам іншыя школьныя заданні. Цяперашнія школьнікі табліцу множання на памяць не ведаюць. У сеціве, на жаль, юны чалавек знаходзіць шмат таго, што яму наогул не патрэбна альбо прыносіць шкоду. Калі нешта ідзе не так, бацькі і грамадства пачынаюць шукаць вінаватых, кажуць, што школа вінавата. Я з гэтым не згодзен. Школа сапраўды аслабла апошнім часам. Але глыбінныя прычыны праблем трэба шукаць у саміх сабе, у кожнай сям'і.

***— І як жа можна пераадолець бездухоўнасць, якой, на жаль, як вірусам, заражаецца пэўная частка маладога пакалення?***

— Калі ўважліва чытаць разважанні старцаў, можна знайсці такую думку: мы знаходзімся ў падарожжы. Духоўны сэнс падарожжа вельмі вялікі. Памятаеце, як Майсей вадзіў па пустыні яўрэйскі народ? Якая ж там адлегласць — з Егіпта да Святой зямлі, а яны ішлі доўгія сорак гадоў. Такі прамежак часу быў патрэбен, каб старое пакаленне з яго дрэннымі звычкамі і няправільнымі духоўнымі ўстаноўкамі памерла, і на змену яму прыйшло новае пакаленне, свабоднае ад заган. Так і тут патрэбен час, каб пераадолець пустыню бязбожжа, атэізму, шматлікіх перамен і перабудоў. За пэўны час чалавек мусіць пераасэнсаваць сваё стаўленне да матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў. Вядома, шлях надзвычай цяжкі. Тыя ж старцы гаварылі: «Калі б усе разам сказалі адначасова: «Госпадзі, даруй нам і памілуй!», свет стаў бы лепшым. Здаецца, простая рэч, толькі ажыццявіць яе немагчыма. Да лепшага нельга прыйсці хутка.

***— Відаць, нярэдка да вас звяртаюцца вернікі з пытаннем, як жыць у цяперашнім няпростым свеце, за што трымацца душой? Што вы адказваеце на такія ці падобныя пытанні?***

— Трымацца трэба найперш за веру, бо без веры нікуды не ступіш... А другое, трэба трымацца за добрую сям'ю. Адзін з вельмі шаноўных нашых святароў сказаў мне аднойчы: «У наш час сям'я — найбольшы духоўны подзвіг». Так яно і ёсць. Чалавек, які стаў добрым сямейнікам, заслугоўвае найлепшай пахвалы. Бо ў сям'і можна навучыцца спагадзе і цярпенню, навучыцца клапаціцца пра іншага, пераадолець уласны эгаізм. А на практыцы мы бачым: працэнт разводаў у адносінах да шлюбаў недзе даходзіць да палавіны. Разводзяцца людзі, якія пражылі ў шлюбе не толькі год-два, але і дзесяць, пятнаццаць, дваццаць гадоў. На маім працоўным стале ёсць папка, дзе зафіксавана скасаванне шлюбаў тых людзей, якія вянчаліся ў царкве. Тут захоўваюцца гісторыі, якія ў пэўнай ступені адлюстроўваюць стан грамадства. А ён характарызуецца тым, што людзі несур'ёзна ставяцца да самага галоўнага ў жыцці кожнага — да стварэння сям'і.

Да мяне гады два таму прыходзіла адна пара. Яны не пражылі ў шлюбе ні дня і прыйшлі разводзіцца. Маладыя людзі распісаліся, павянчаліся, а за вясельным сталом дзве сваццproperly не знайшлі агульнай мовы. У выніку канфлікту паміж маці жаніха і нявесты вяселле проста разагналі. Гэтая гісторыя падобна да анекдота, але, на жаль, гэта чыстая праўда...

Раней у беларускай вёсцы, ды і не толькі ў вёсцы, у традыцыі панавала іншае стаўленне да шлюбу. Без бацькоўскага благаславення ніхто пад вянец не ішоў. Цяпер згоды не пытаюць, над рашэннем доўга не думаюць, і вынікі не прымушаюць сябе чакаць.

Значыць, недастаткова пераканаўча мы даводзім маладому пакаленню, што сям'я — гэта малая царква, аснова ўсяго. Будзе моцная сям'я — будзе моцная дзяржава. Так было спакон вякоў на нашай зямлі. Але за апошняе стагоддзе страчана нямала традыцый, якія мелі ўплыў на духоўны стан грамадства. Я кажу пра пашану да сваіх каранёў, самабытнасці, веры бацькоў і дзядоў. Хоць тут, на Палессі, што прыемна, многае засталося, праўда, найбольш у асяродку старэйшага пакалення. Вяскоўцы не забыліся пра звычаі продкаў, не выкінулі народны касцюм. Калі ў Жыровічы на 20 мая з'язджаюцца вернікі, то давыд-гарадоцкіх жанчын можна лёгка адрозніць па адмысловых галаўных уборах. Жыхаркі ганцавіцкіх вёсак вылучаюцца яркімі колерамі сваіх строяў. Прыемна, што і ў хатах многіх палескіх гаспадынь захоўваюцца вышыўкі, абрусы, адзенне з часоў іх бабуль і матуль. Палешукі — людзі разважлівыя, няспешныя ў прыняцці рашэнняў, разам з тым настойлівыя, працавітыя.

***— Такія, якімі апісаў іх Якуб Колас у сваім рамане «На ростанях»?***

— Так, усё апісана праўдзіва, і многае актуальна. Тут жа спрэс коласаўскія мясціны, дзе ён маладым настаўнічаў: і Пінкавічы, і Люсіна. Дарэчы, Канстанцін Міцкевіч вянчаўся са сваёй жонкай Марыяй Дзмітрыеўнай у нашай Свята-Варварынскай царкве. У яго творы напісана, што вянчаліся маладыя настаўнікі ў чыгуначнай царкве. Я нядаўна знайшоў звесткі, што Пінская Варварынская царква была перададзена чыгуначнаму ведамству ў 1906 годзе. Значыць, гаворка ідзе менавіта пра гэтую царкву. Думаю, было б нялішнім з гэтай нагоды змясціць мемарыяльную дошку на будынку храма. Ёсць жа такая дошка на саборы ў Маскве, дзе вянчаўся Пушкін.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

## Даведка «Звязды»

***Архіепіскап Стэфан (Ігар Пятровіч Корзун) нарадзіўся ў 1944 годзе ў вёсцы Корзуны Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. У 1975 годзе скончыў Маскоўскую духоўную семінарыю, а ў 1979 годзе — Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. У 1989-1990 гады — рэктар Мінскай духоўнай семінарыі. З 4 сакавіка 1990 года — епіскап Пінскі і Лунінецкі. 25 лютага 2000 года ўзведзены ў сан архіепіскапа. Узнагароджаны ордэнам прападобнага Сергія Радaнежскага III ступені, ордэнам прападобнага Сергія Раданежскага II ступені, ордэнам святога дабравернага Даніiла Маскоўскага II ступені.***

Кніжная паліца

# КЛАСІКІ ГАВОРАЦЬ...

**Напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы ў адной са старэйшых бібліятэк сталіцы — імя Льва Талстога — адбылася прэзентацыя кнігі Таццяны Падаляк «Дыялогі на мяжы стагоддзяў. Класікі і сучаснікі ў інтэр'еры часу», якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Вядомыя постаці беларускай літаратуры і культуры на старонках выдання разважаюць пра жыццё, каханне, чалавечыя каштоўнасці... і мову.**



Кніга — вопыт шматгадовай плённай працы аўтаркі. Падчас працы ў газеце «Звязда» на працягу многіх гадоў Таццяна Уладзіміраўна сустракалася з вядомымі людзьмі эпохі, з іх роднымі і нашчадкамі. У выніку найцікавейшыя інтэрв'ю выходзілі на палосах рэспубліканскай газеты, часам ствараючы пэўную сенсацыю. Менавіта з гэтых публікацый некаторыя чытачы ўпершыню даведаліся пра нялёгкае дзяцінства Кузьмы Чорнага, вядомых паклоннікаў актрысы Купалаўскага тэатра Галіны Бальчэўскай, драматычную біяграфію Міхаіла Савіцкага...

На прэзентацыю прыйшло шмат моладзі. Прычым, як ні дзіўна, пераважалі джэнтльмены, якія вучацца ў ліцэі №5 транспартнага будаўніцтва. Калі параўноўваць са школай — вучні старэйшых класаў. Таццяна Падаляк, як таленавіты выкладчык Інстытута журналістыкі БДУ, улавіла гэтую акалічнасць і павяла гутарку ў межах школьнай праграмы. І ўсё, як кажуць, не без падстаў: у яе кнізе не адно інтэрв'ю прысвечана класікам беларускай літаратуры, чые творы якраз вывучаюць старшакласнікі. Адным словам, атрымалася прэзентацыя-ўрок. Падлеткі мелі ўнікальную магчымасць пазнаёміцца з класікамі не толькі ў якасці аўтараў паэзіі ці прозы, а ўбачылі ў іх звычайных людзей са сваімі марамі, думкамі, перажываннямі.

І невыпадкова кандыдат філалагічных навук, дацэнт пачала з Пімена Панчанкі — чалавека, які не адзін верш прысвяціў роднай мове.

— Так атрымалася, што апошняя сустрэча з журналістамі ў Пімена Панчанкі адбылася са мной, — расказвае Таццяна Уладзіміраўна. — Я была яшчэ зусім маладой. І вось што мяне ўразіла. Пімен Панчанка быў ужо вельмі пажылым чалавекам і вельмі хворым — ногі паэта амаль не слухаліся, але, тым не менш, ён мяне сустракаў стоячы. «Я не магу не выказаць павагу і пашану жанчыне», — такімі былі яго словы.

Як успамінае аўтарка кнігі, Пімен Панчанка з крыўдай успамінаў, як адвярнуліся ад беларускай мовы. У 50-я гады навучанне ў многіх школах, тэхнікумах і ВНУ вялося па-беларуску. Але тут прыехаў у Мінск кіраўнік СССР Мікіта Хрушчоў. А тагачасны кіраўнік нашай краіны Кірыл Мазураў, былы партызан і valявы чалавек, у тэатры оперы і балета чытаў даклад на беларускай мове. Хрушчова гэта вельмі раззлавала, і, па ўспамінах Пімена Емяльянавіча, ён сказаў: «Запомните: кто быстрее перейдёт на русский язык, тот быстрее придёт в коммунизм». І літаральна на наступны дзень у Беларусь прыйшла тэлеграма тагачаснага міністра культуры Кацярыны Фурцавай, у якой гаварылася, што беларускую мову навучання патрэбна скасаваць, перайсці на рускую. Вядома, якім гвалтам гэта рабілася.

Вельмі сябраваў з Піменам Панчанкам Максім Танк. Нельга забыць яго верш «Родная мова», які таксама вывучаецца па школьнай праграме.

— Максім Танк напісаў гэты верш падчас вайны — у 1943 годзе, — скіроўвае ўвагу школьнікаў Таццяна Падаляк. — Ён быў выкліканы з фронту і працаваў у Маскве ў газеце «За Савецкую Беларусь». Душа балела за Беларусь, за родную мову. Як, дарэчы, і да вайны. Яўген Іванавіч Скурко родам быў з Заходняй Беларусі, дзе, як вядома, беларуская мова была пад забаронай. У канцы 1930-х гадоў польскі міністр асветы Скульскі заявіў, што праз 10 гадоў у Польшчы (у яе складзе была Заходняя Беларусь) нават са свечкай не знойдзецца ні аднаго беларуса. І малады Максім Танк, бунтар, прыгажун, яшчэ зусім юнак, напісаў чатыры радкі, за якія яго пасадзілі ў турму на Лукішках, што ў Вільні. Вось яны:

*«Калі няма на свеце маёй мовы,*
*Майго народа і мяне самога,*
*Дык для каго будуеце, панове,*
*Канцлагеры, катоўні і астрогі?»*

— Што яшчэ мяне ўразіла з аповеду сына паэта (у кнізе змешчаны дыялог з сынам Танка Максімам) дык гэта завяшчанне Максіма Танка, — працягвае аўтарка кнігі. — У сваім завяшчанні ён прасіў пахаваць яго на тых могілках, дзе пахаваны яго бацькі (ён з Мядзельскага раёна). Яўген Іванавіч хацеў, каб не ставілі ніякага помніка, а толькі на стэле, якую ён некалі паставіў сваёй маці, напісалі яго імя. Яшчэ Максім Танк прасіў, каб не называлі яго іменем вуліц і ўстаноў, не ставілі помнікаў, не вешалі мемарыяльных дошак, а на пахаванні не неслі ордэнаў. Вось што яшчэ ўразіла сына. Бацькаву труну паставілі ў садзе на табурэтках, была страшэнная гарачыня. Па краях усяго перыметра труны сядзелі зялёныя конікі. Прычым так шчыльна, што адзін аднаго скідвалі. І ў такім незвычайным абрамленні адбывалася развітанне з народным паэтам Беларусі.

Не абышла ўвагай Таццяна Падаляк і Кузьму Чорнага. Яна размаўляла з яго дачкой Рагнедай. Вельмі цяжкім быў лёс у пісьменніка. І ў сённяшніх падручніках не пішацца, што, аказваецца, Кузьма Чорны быў рэпрэсаваны. Праўда, праз 8 месяцаў яго адпусцілі. Самае цікавае, што ён ведаў, хто напісаў на яго данос, але дараваў гэтаму чалавеку. Дачка Кузьмы Чорнага не адкрыла, што гэта быў за пісьменнік. Толькі сказала, што потым гэты чалавек прыходзіў да іх у хату, яны доўга размаўлялі з Кузьмой Чорным. На здзіўленне журналісткі, дачка пісьменніка дадала: бацьку вельмі падабалася з ім размаўляць, што сведчыць аб тым, якім мяккім чалавекам ён быў.

Колькі цікавага з вуснаў аўтаркі давялося пачуць і пра Петруся Броўку. Тым больш, што ліцэісты хутка будуць праходзіць яго паэму «Голас сэрца». «Хочаце ведаць, чаму ён напісаў гэты твор? — заінтрыгавала падлеткаў Таццяна Падаляк. — Яго маці замучылі ў Асвенцыме, яна была спалена ў гэтым страшэнным канцлагеры... Увогуле, ён нарадзіўся ў беднай сям'і, дзе было 10 дзяцей. Пашчасціла гутарыць з сынам Петруся Броўкі Юрыем. І мяне цікавіла, як ён стаў паэтам. Цудоўна ён пра гэта сказаў сам у сваім вершы:

*«Не пытайся пра гэта,*
*Бо адказу не дам.*
*Як зрабіўся паэтам,*
*Я не ведаю сам.*

*Свой радок на паперы*
*Не чакаў я спаткаць.*
*Проста сэрца без меры*
*Захацела спяваць...»*

— Калі ведаеш гэтыя дэталі біяграфіі, зусім інакш глядзіш на тое, што напісаў чалавек, — пераканана Таццяна Падаляк.

Не выклікае сумнення: кніга вартая таго, каб яе прачыталі. Тут можна даведацца і пра адзінае каханне Максіма Танка, і пра гісторыю псеўданіма Кузьмы Чорнага, і пра тое, каму Пятрусь Броўка прысвяціў свой верш «Александрына», каго кахаў Уладзімір Караткевіч, пра асабістую ваенную трагедыю сям'і Івана Чыгрынава, пра жыццёвы шлях паэта-песенніка Аляксандра Лягчылава... Дарэчы, гэта толькі першая частка выдання. Яна пра тых, хто ўжо пайшоў з жыцця. Неўзабаве свет убачыць і другая частка. У ёй будуць не менш знакамітыя асобы, найцікавыя факты з іх біяграфіі, малавядомыя старонкі асабістага жыцця — на гэты раз нашых сучаснікаў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара**

# «МЫ ДА АПОШНЯГА ВЕРЫЛІ, ШТО ЮЛЕЧКА ПРАЧНЕЦЦА...»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

«У нас было поўнае разуменне, — кажа Юрый. — Юля была доўгачаканым дзіцем. Мы з Алай рабілі для яе ўсё, што маглі. І яна пра нас клапацілася. На сярэбранае вяселле зрабіла нам сюрпрыз: замовіла рэстаран, тамаду. Калі Вадзім, з якім яны 8 гадоў сябравалі, зрабіў прапанову, Юля пачала рыхтавацца да вяселля. Завяла спецыяльны дзённік, каб нічога не забыцца. Сярод пунктаў былі і такія, як «упрыгожыць пакой для выкупу нявесты», «прыгожа адзець тату»... Юля была таленавітым дызайнерам. За што б ні бралася, усё хацела давесці да ідэальнага стану... Вельмі даражу прыгожым будаўнічым касцюмам, які Юля правезла мне з Літвы. Казаў ёй, «дачушка, навошта ты трацілася, у мяне ж хапае старых штаноў ды куртак, каб працаваць на лецішчы». А яна толькі ўсміхалася (Юрый нейкі час маўчыць, збіраецца з думкамі). ...Нават пасля таго, як дачкі не стала, я атрымаў ад яе падарунак на свой дзень нараджэння, — на вочы мужчыны наварочваюцца слёзы. — Мастак Юрый Якавенка прынёс карціну. Я яму адразу сказаў, што не магу прыняць такі падарунак, бо ведаў, што карціна вельмі дарагая. «Калі даведаецеся ад каго яна, не адмовіце», — пачуў у адказ. Аказалася, гэту карціну Юля нагледзела яшчэ ў сакавіку, перад аперацыяй. Уяўляеце, у яе аперацыя, а яна думае, які падарунак мне зрабіць у чэрвені...

**— Што было на той карціне?**

— Карціна называецца «Цмок». Я нарадзіўся ў год Цмока.

...Юлі было ўсяго 25. Пасля ўніверсітэта яна паспела папрацаваць у выставачнай зале Гродзенскага гарвыканкама, дызайнерам-афарміцелем у адным з атэляў Гродна.

**Усе як адзін думалі пра сябе, пра тое, як сысці ад пакарання, клапаціліся пра карпаратыўныя інтарэсы... І не далі Юлі апошняга шанцу на жыццё.**

— У нас з Алай свой бізнес, звязаны са стварэннем рэкламы. Усе здзіўляліся, чаму мы Юлю да сябе на працу не бяром. А яна сама не ішла, бо разумела, што мы яе заўсёды прымем. Працавала на іншых людзей, не хацела, каб яе ўспрымалі як «татаву дачку». Юля была таленавітай. Перамагла ў конкурсе плакатаў супраць СНІДу і стала прэзідэнцкім лаўрэатам. За плакат, прысвечаны тэме бежанцаў, атрымала прэмію ЮНЕСКА. Дачка ўваходзіла ў лік «залатой моладзі». Калі прапанавалі паехаць вучыцца ў Італію, Германію, Францыю, Юля, адна з групы, адмовілася. Сказала: «Хачу быць з вамі...»

Паступіла дзяўчына вучыцца на дызайнера ў суседнюю Літву. Практычна кожныя выхадныя прыязджала дадому. Спачатку на цягніку, пасля атрымала еўрапейскія правы.

— Паступала на платную форму навучання, але добра здала сесію, і яе перавялі на бясплатную. Нават стала атрымліваць стыпендыю. За сэканомленыя на вучобе грошы мы набылі ёй машыну.

## «Галоўнае — не пластыка. Ёй было цяжка дыхаць па начах»

Праблемы з носам пачаліся ў Юлі ў дзяцінстве, пасля таго, як у школьным двары ёй трапілі ў твар сняжком.

— Снег быў мокры. З носа пайшла кроў. Мяне адразу выклікалі з працы. Я адвёз дачку ў траўмапункт. Але там сказалі, што ўсё добра, і адправілі дадому. Пазней аказалася, што нос быў зламаны. З часам у Юлі на носе з'явілася гарбінка, каля яе — ямінкі, адна ноздра практычна не дыхала. Урачы казалі, што, калі не зрабіць аперацыю, з узростам нос будзе «правальвацца» яшчэ больш, бо храсткі дрэнна прыраслі.

Юля збіралася замуж 31 жніўня. Ужо і заяву з Вадзімам падалі, і ў рэстаране аванс пакінулі. Таму, каб да вяселля, як кажуць , «загаілася», яна вырашыла зрабіць аперацыю вясной.

Хірурга выбірала сама па інтэрнэце. Водгукі пра Віктара Серабро былі станоўчыя. 35 гадоў стажу. Да таго ж хірург з'яўляецца загадчыкам аддзела пластычнай хірургіі дзяржаўнай бальніцы. У «Экамедсэрвісе» ён працаваў па сумяшчальніцтве на паўстаўкі.

Тады, вядома, ні бацькі, ні яе жаніх, ні сама дзяўчына не маглі і падумаць, чым скончыцца для іх вечар 26 сакавіка...

— Замест дзвюх гадзін аперацыя доўжылася амаль тры. Дзесьці ў 19.40 адчыніліся дзверы аперацыйнай, нашу дачку павезлі ў палату. Яна дыхала вельмі надрыўна і цяжка. Праз нейкі час нам дазволілі ўвайсці ў палату. Там нас з Алай ахапіў жах: Юля не варушылася. Мы сталі надзяваць ёй цёплыя шкарпэткі — ведалі, што пасля аперацыі вельмі мерзнуць ногі. Я занепакоіўся, бо ведаю, як гэта выходзіць з наркозу: сам перанёс 7 аперацый. Але ўсе вакол пераконвалі, што ўсё ідзе па плане. Анестэзіёлаг сказаў, што, калі мы Юлю пабудзім, яна ўсю ноч будзе мучыцца ад болю. Чым і прытупіў нашу пільнасць. Вядома, хто ж хоча нанесці боль свайму дзіцяці...

У той дзень бацькам ніхто не сказаў, што падчас аперацыі адбылася пазаштатная сітуацыя.

Бліжэй да 23.00 ахова папрасіла пакінуць палату... Кожныя паўгадзіны, ужо з дому, Юрый з Алай тэлефанавалі, каб высветліць, ці прыйшла ў прытомнасць дачка. Каля дзвюх гадзін ночы ім патэлефанаваў хірург Серабро і сказаў, што Юля ў рэанімацыі...

**— Што апошняе сказала Юля, памятаеце?**

— «Мама, не сварыся на тату». ...Так атрымалася, што ў той злашчасны дзень я праскочыў паварот на «Экамедсэрвіс». Усё ж такі Мінск не такі знаёмы горад, як Гродна. У нас быў запіс на вызначаны час, таму Ала пачала нервавацца, нават прыкрыкнула на мяне...

...23 красавіка Юрый з Алай пачалі бегаць па Мінску ў пошуках вясельнай сукенкі — але ўжо для іншай мэты...

— Калі супрацоўнікі салона даведаліся, чаму з намі няма нявесты, яны расплакаліся, — узгадвае Юрый. — Няма нічога страшней за смерць уласнага дзіцяці, асабліва калі яно памірае ў пакутах.

...Пасля пахавання дачкі Ала Кубарава сама трапіла ў рэанімацыю з сардэчным прыступам. І дагэтуль, прызнаўся Юрый, яна «сядзіць» на антыдэпрэсантах, якія прапісалі ўрачы.

— Мы з жонкай знаходзімся ў дэпрэсіі, нас мучыць бяссонніца. Першы час на пару гадзін выходзілі на працу, цяпер — на цэлы дзень. Ведаеце, сядзець без справы вельмі цяжка. Добра, што ў нас ёсць за 4 кіламетры ад Гродна лецішча: уцякаем туды ад сумных думак. У прыватным доме заўсёды занятак можна знайсці: нешта прыбіць, падфарбаваць. Трэба хоць нейкай механічнай працай займацца. Ведаеце, калі здарылася бяда, першае жаданне было наогул кінуць усё і з'ехаць з краіны куды вочы глядзяць, каб цябе ніхто не ведаў. Але ад сябе не ўцячэш...

**«Наша трагедыя павінна стаць сігналам нядбайным урачам. Яны павінны альбо самі звольніцца, альбо іх павінна звольніць кіраўніцтва».**

**— Юрый, а праўда, што вы хочаце ўсынавіць дзіця?**

— Мы думалі пра гэта даўно, яшчэ калі Юля была жывая. Цяпер, каб нейкім чынам зачапіцца за гэтае жыццё, знайсці ў ім сэнс, вырашылі ажыццявіць даўняе жаданне. Спадзяёмся, што ў нас усё атрымаецца. Праўда, па нашых законах трэба, каб пасля смерці Юлі прайшоў год. І, думаю, гэта правільна. Бо ўсынаўленне — сур'ёзны крок. Гэта павінна быць свядомае рашэнне, а не выклікана адчаем.

## «Лепш бы я тых грошай не зарабіў...»

**— На форумах людзі рознае пішуць, асабліва пасля таго, як даведаліся, што «Экамедсэрвіс» павінен выплаціць вам больш як мільярд рублёў у якасці кампенсацыі матэрыяльнай і маральнай шкоды...**

— Калі нехта думае, што мы падалі іск, бо хочам нажыцца на смерці дачкі, гэта іх права. Я нікому нічога даказваць не збіраюся. Мы забяспечаны: і кватэра ёсць, і дом. Зразумела, грошы нам Юлю не заменяць. Гэта сімвалічнае пакаранне. Бо, заўважце, «Экамедсэрвіс» наогул ніяк не праходзіў па крымінальнай справе... Падчас аперацыі адключыўся апарат штучнага дыхання: аказалася, ніхто не цікавіўся яго спраўнасцю ажно тры гады! Галоўны інжынер медцэнтра сказаў на судзе, што калі б Міністэрства аховы здароўя патрабавала, ён адрамантаваў бы апарат... Ён не сказаў: «Адрамантаваў бы, калі б ведаў, што гэта пагражае жыццю пацыентаў...» Гэта так мяне абурыла!.. Як і тое, што анестэзіёлаг не дачакаўся, пакуль Юля прыйдзе ў прытомнасць пасля аперацыі, і паехаў у Маскву на чарговую аперацыю. Людзі толькі аб прыбытку думаюць, таму з нашага боку гэта толькі спосаб прымусіць кіраўніцтва задумацца, каго яны наймаюць. У маёй галаве не ўкладваецца: як можна было ўзяць для абслугоўвання медыцынскага абсталявання чалавека з сельгасадукацыяй (маецца на ўвазе Вадзім Ліхута. — **Аўт**.)?..

**— Я так разумею, вы не задаволены рашэннем суда? (Нагадаю, 31 студзеня суд прагаварыў анестэзіёлага Аляксандра Шурава і галоўнага інжынера Вадзіма Ліхуту, адпаведна, да 4 і 3 гадоў калоніі-пасялення, гендырэктара Галіну Валжанкіну — да 2 гадоў умоўнага абмежавання волі. — Аўт.)**

— Я разумею, што ніякае пакаранне нам Юлю не верне. Нават калі б ім смяротнае пакаранне вынеслі. Тым не менш, на мой погляд, імёны ўсіх вінаватых у смерці нашай дачкі павінны быць агучаны. Інакш атрымліваецца, суд не меў ніякага сэнсу, і медыкі будуць думаць, што заўсёды можна «адмазацца». Мы пайшлі на гэты душэўны боль, каб такое больш ніколі не паўтарылася, каб дапамагчы іншым людзям, якія будуць звяртацца да ўрачоў. Чаму не назвалі хірурга? Я не разумею, як такое можа быць, што галоўны інжынер вінаваты, а хірург, які рабіў аперацыю, — не? Калі на судзе кажуць, што яго нельга пазбаўляць ліцэнзіі, што ён можа яшчэ ратаваць шмат людзей, то я гэтага не разумею. Разумею, калі б гэта быў адзін урач на ўсю краіну, які робіць найскладанейшыя аперацыі на сэрцы. А Віктар Серабро — пластычны хірург.

Я лічу, што вінаватая ўся аперацыйная брыгада. Менавіта іх безадказнасць прывяла да смерці нашай дачкі. Вядома, ёсць віна і кіраўніцтва «Экамедсэрвіса», якое сэканоміла на абсталяванні. Але тут гаворка ідзе пра антычалавечнасць, урачы забыліся на клятву Гіпакрата. Я разумею, што ўсякае магло здарыцца, але пакінуць пацыента ў такой сітуацыі і не паспрабаваць яго ратаваць — гэта злачынства... Гэта тое ж самае, як збіць чалавека і пакінуць яго на дарозе, не аказаўшы дапамогу. Быў бы сярод іх хоць бы адзін сумленны чалавек, выклікаў бы «хуткую»... А выйсці з аперацыйнай — і тут жа збегчы? Усе як адзін думалі пра сябе, пра тое, як сысці ад пакарання, клапаціліся пра карпаратыўныя інтарэсы... І не далі Юлі апошняга шанцу на жыццё.

За аперацыю Кубаравы заплацілі 15 мільёнаў. Думалі, паколькі кошт высокі, вынік павінен быць найлепшым.

— Лепш бы я гэтых грошай не зарабіў, — уздыхае Юрый. — Я даверыўся рэкламе, лічыў, што там добрыя спецыялісты. Аказалася ж, што бардак — гэта яшчэ мяккае слова, якое характарызуе сітуацыю ў гэтым медыцынскім цэнтры... І гэты бардак выліўся на нас. Атрымліваецца, гэта ў іх норма — узяць грошы, але не правяраць апаратуру, якая забяспечвае жыццёва важную функцыю дыхання, кінуць чалавека, не пераканаўшыся, што той прыйшоў у свядомасць. Наша трагедыя павінна стаць сігналам нядбайным урачам. Яны павінны альбо самі звольніцца, альбо іх павінна звольніць кіраўніцтва.

*Балючая гісторыя дагэтуль не ўкладаецца ў маёй галаве. Няўжо трэба было прынесці ў ахвяру Юлю, маладую і прыгожую, каб усе зразумелі, што кожны чалавек на сваім месцы павінен добрасумленна выконваць свае абавязкі?*

*...А ўсё пачалося з таго злашчаснага сняжку. Дактары ў той час, пэўна, таксама спяшаліся дадому і замест таго, каб проста падправіць дзіцяці носік, кінулі жартаўліва: «Да вяселля зажыве». Праз шмат гадоў урачэбная халатнасць паўтарылася...*

*Застаецца дадаць, што кропка ў гэтай справе яшчэ не пастаўлена. Як гэта ні дзіўна, касацыйныя скаргі на рашэнне суда першай інстанцыі падалі ўсе тры абвінавачаныя...*

**Надзея ДРЫЛА.**

К сведению акционеров

# ОАО «Витебские ковры»

**ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ СОСТОИТСЯ 26 марта 2014 г. в 14.00**
**по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 75.**

Регистрация акционеров в день проведения собрания – **с 12.30 до 13.50**, (иметь документ, удостоверяющий личность). Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров **на 12.03.2014 г.**

**Повестка дня**

1. Отчет об итогах работы Общества за 2013 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2014 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2013 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 г.
4. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2013 год.
5. О распределении чистой прибыли, полученной в 2013 году, и направлениях ее использования в 2014 году.
6. О выплате дивидендов за 2013 год.
7. Выборы членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
